№№47—48
(2567—2568)

23 сакавіка 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

“Народная воля” прапануе ўвазе чытачоў урывак з п’есы вядомага беларускага драматурга-гісторыка **Алеся ПЕТРАШКЕВІЧА “Приласкать и уничтожить!”**

У ёй падаюцца падзеі, звязаныя з Першым Усебеларускім з’ездам 1917 года, стварэннем і дзейнасцю незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі (1917—1919).

(Глядзіце старонкі 3—4.)

Іх лёс хвалюе Беларусь!



Юрый ЗАХАРАНКА
знік 2771 дзень таму

Віктар ГАНЧАР
знік 2739 дзён таму

Анатоль КРАСОЎСКІ
знік 2739 дзён таму

Дзмітрый ЗАВАДСКІ
знік 2447 дзён таму

Аляксандр КАЗУЛІН
за кратамі 362 дні

Зміцер ДАШКЕВІЧ
за кратамі 188 дзён

Мікалай СТАТКЕВІЧ
660 дзён як асуджаны (знаходзіцца на «хіміі»)



Павел СЕВЯРЫНЕЦ
660 дзён як асуджаны (знаходзіцца на «хіміі»)

Артур ФІНЬКЕВІЧ
316 дзён як асуджаны (знаходзіцца на «хіміі»)

ПРАТЭСТ

Пласт праблем на «Тэрмапласце»

На пачатку гэтага тыдня рабочыя мінскага прадпрыемства “Тэрмапласт” выступілі з патрабаваннямі да свайго кіраўніцтва.

Адбыўся нават невялікі страйк, на якім людзі запатрабавалі павысіць ім заробкі. Апошнія распавядалі, што грошай плацяць мала, асноўныя фонды зношаны, перспектыў развіцця не бачна.

Цікава, што калі рабочыя патэлефанавалі на “гарачую лінію” АНТ, тэлевізіёншчыкі, відаць, палічылі гэтую сітуацыю дробяззю, бо проста праігнаравалі сігнал. А вось кіраўніцтва прадпрыемства, напэўна, скеміла, што за публічнасць праблемы можна атрымаць і па шапцы ад вышэйстаячага начальства.

Як стала вядома карэспандэнту “Народнай волі”, кіраўніцтва завода ўзялося-такі разглядаць пытанне павышэння заробку рабочым, аднак якім чынам яны збіраюцца вырашыць праблему — пакуль таямніца. Ва ўсялякім выпадку на прадпрыемстве ад каментарыяў адмаўляюцца.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Нафтавы ультыматум

Беларусь зноў можа застацца без нафты

Расійскія кампаніі з красавіка, магчыма, спыняць давальніцкую перапрацоўку нафты на беларускіх НПЗ. Нафтавікі падлічылі, што зараз больш выгадна вырабляць паліва ў Расіі.

Калі гаварыць проста, давальніцкія схемы — гэта калі НПЗ не праплачваюць грошы за пастаўленую сыравіну, разлік вядзецца, як кажуць, натурпрадуктам. За кошт гэтых схем Беларусь, не ўкладваючы вялікіх грошай у сыравіну, мела магчымасць забяспечваць сябе і бензінам, і дызпалівам. Але...

“Усе прадстаўнікі расійскіх кампаній, якія працуюць у Беларусі, днямі пацвердзілі разлікамі, што давальніцкія схемы перапрацоўкі нафты ў Беларусі сталі стратнымі”, — паведамляе агенцтва “Інтэрфакс”. Ужо ў сакавіку ад давальніцкіх схем адмовіліся “Лукойл” і “Роснефть”. Пакуль не спыніліся пастаўкі ад “Славнефти” і “Роснефти”, але калі Беларусь захавае цяперашнія падатковыя ўмовы перапрацоўкі, і яны маюць намер адмовіцца ад паставак нафты ў нашу краіну. У гэтым выпадку беларускія заводы будуць вымушаны самі закупляць нафту. І калі зыходзіць з раней запланаванага сярэднемесячнага аб’ёму перапрацоўкі ў 1,8 мільёна тон, то кожны месяц беларускія НПЗ на гэтыя мэты павінны будуць знайсці 400 мільёнаў долараў. У заводаў такіх грошай няма.

“Беларускія ўлады павінны выбіраць: альбо паменшыць падатковы цяжар на нафтаперапрацоўку, альбо заняцца развіццём іншых галін эканомікі, каб з’явіліся ”новыя грошы”, — так пракаментціраваў сітуацыю Яраслаў Раманчук, кіраўнік даследчага цэнтра Мізеса ў Мінску.

Ігар МАРОЗАЎ.

НАПЯРЭДАДНІ

Вінцук ВЯЧОРКА: «Гэта будзе абсалютна мірная акцыя, падкрэслена неканфрантацыйная...»

Мінгарвыканкам забараніў святкаванне Дня Волі на Кастрычніцкай плошчы **(такая інфармацыя была на 20 сакавіка. — Аўт.)**

У якасці альтэрнатывы чыноўнікі дазволілі шэсце ад Акадэміі навук на плошчу Бангалор.

19 сакавіка экс-кандыдата ў прэзідэнты **Аляксандра Мілінкевіча**, а таксама іншых заяўнікаў акцыі, сярод якіх **Віктар Івашкевіч, Вінцук Вячорка**, **Анатоль Ляўковіч** і **Ігар Шынкарык** выклікалі ў гарвыканкам, дзе папрасілі падпісаць паперы аб тым, што яны папярэджаны аб крымінальнай адказнасці ў выніку парушэння грамадскага парадку.

“Улада выбрала канфрантацыю, — сказаў член Аб’яднанай грамадзянскай партыі **Ігар Шынкарык.** — *Усе нашы спробы пайсці на дыялог не знайшлі падтрымкі. Нам спрабавалі ўручыць пракурорскія папярэджанні, у якіх утрымлівалася спасылка на артыкул, па якім былі асуджаны Андрэй Клімаў, Павел Севярынец і Мікола Статкевіч. Мы адмовіліся іх падпісаць, бо лічым, што ўлады прынялі незаконнае рашэнне”.*

Аляксандр Мілінкевіч лічыць, што забарона сабрацца на Кастрычніцкай плошчы сведчыць пра бяссілле ўлады.

“Улады не здалі экзамен на спеласць, — гаворыць ён. — *Гэта памылка ўлад, якія ідуць на канфрантацыю. Яны прадэманстравалі сваё бяссілле і неахвоту прыняць да ўвагі жаданне грамадскасці”.*

І усё ж такі святкаванне Дня Волі адбудзецца. Пра гэта “Народнай волі” сказаў старшыня аргкамітэта па падрыхтоўцы акцыі **Вінцук Вячорка.**

— *Улады забаранілі акцыі на так званай Кастрычніцкай плошчы, але далі дазвол на праход ад Акадэміі навук да так званай плошчы Бангалор,* — сказаў Вячорка. -- *Людзі ж ведаюць, што збор адбудзецца на так званай Кастрычніцкай плошчы, бо яны туды запрошаны. Мы будзем зыходзіць менавіта з гэтага. У бліжэйшы час адбудзецца пасяджэнне аргкамітэта, на якім будзе вызначаны канкрэтны план нашых дзеянняў на 25 сакавіка. Мы застаёмся ў святочным фармаце. Гэта будзе абсалютна мірная акцыя, падкрэслена неканфрантацыйная...*

Даша ПАЎЛОЎСКАЯ.

АКЦЫЯ

Беларусь — у Савет Еўропы!

80 вядомых асоб краіны падтрымалі грамадзянскую ініцыятыву

У Мінску адбылася прэс-канферэнцыя, удзельнікі якой абвясцілі пачатак грамадзянскай кампаніі “Беларусь — у Савет Еўропы!”. Кампанію прэзентавалі **Ігар ЛЕДНІК** ад аргкамітэта праваабарончага руху “Наша Беларусь”, **Аляксандр МАКАЕЎ** ад Каардынацыйнага савета мінскіх індывідуальных прадпрымальнікаў, **Вячаслаў СІЎЧЫК** ад незарэгістраванага руху беларускай салідарнасці “Разам”, прадстаўнікі А.У.Казуліна — **Ірына КАЗУЛІНА** і **Ігар РЫНКЕВІЧ** і іншыя грамадскія дзеячы. Ад самага пачатку гэтую маштабную нацыянальную акцыю падтрымаў **Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ** і блізкія да яго маладзёжныя арганізацыі.

Мінулая прэс-канферэнцыя праходзіла ў дзень, калі Парламенцкая Асамблея Савета Еўропы разглядала ў Парыжы сітуацыю ў Беларусі і прызначала спецыяльнага дакладчыка па нашай краіне (ім стаў **Андрэа РЫГОНІ,** лідэр італьянскай дэлегацыі ў ПАСЕ). Таму было важна не толькі прадэманстраваць, што значная частка беларускага насельніцтва адгукнулася на партнёрскія прапановы Еўрасаюза і яго 12 умоў па дэмакратызацыі да беларускага ўрада, але і праявіць гатоўнасць беларускай дэмакратычнай грамадскасці сфармуляваць праграму сумесных з Еўропай дзеянняў. Адным з першых крокаў ініцыятарам бачылася кампанія па зборы подпісаў беларускіх грамадзян у падтрымку прапаноў і ўмоў Еўрасаюза і ў гэтай сувязі прыняцце плана сумесных дзеянняў па прыняцці Беларусі ў Савет Еўропы.

Тады ж была заяўлена аб важнасці вызначэння прававога статуса А.Р.Лукашэнкі, што патрэбна для фармулявання пазіцыі аб’яднанных дэмакратычных сіл у магчымых перамовах паміж уладай і апазіцыяй з удзелам міжнародных структур, перад усім еўрапейскіх структур.

Веліч абвешчаных задач, пэўная іх супярэчлівасць выклікалі ў бок ініцыятараў кампаніі неадназначную рэакцыю некаторых незалежных журналістаў (замест спроб інтэлектуальнага супрацоўніцтва). А вось беларускія ўлады ўспрынялі кампанію сур’ёзна і прынялі свае захады. Яшчэ больш аб’ектыўная рэакцыя пайшла ад кіраўніцтва аб’яднанай Еўропы.

Галоўнае, што наша грамадзянская супольнасць, персаніфікаваная ў асобах лідэраў маладзёжных, студэнцкіх і хрысціянскіх арганізацый, сказала сваё гучнае “Так!” збліжэнню Беларусі з дэмакратычнай Еўропай. Ёсць спадзяванне, што каманды абодвух экс-кандыдатаў у прэзідэнты, як і кіраўніцтва ўсіх дэмакратычных партый Беларусі, згуртуюцца дзеля агульнай працы.

У гэтыя дні ініцыятары кампаніі выйшлі на наступны этап — да беларускіх грамадзян звярнулася яшчэ больш шырокае кола вядомых грамадскіх дзеячаў (больш за 80 асоб) з заклікам падтрымаць нацыянальную кампанію. Ніжэй прапануецца тэкст падпісанага лідэрамі грамадскай думкі Звароту, які быў урачыста абвешчаны падчас першай вясенняй акцыі 2007 года — мітынгу прадпрымальнікаў 12 сакавіка.

Днямі пачаўся збор подпісаў беларускіх грамадзян у падтрымку праграмы Еўрасаюза і падрыхтоўкі адпаведнага плана сумесных дзеянняў па прыняцці Беларусі ў Савет Еўропы (узор падпіснога ліста кампаніі дадаецца). Мяркуецца арганізаваць па ўсёй Беларусі рэгіянальныя камітэты для збору подпісаў, якія затым будуць перададзены ў цэнтральныя органы еўраструктур.

За інфармацыяй адносна кампаніі можна звяртацца па нумары маб.тэл.: **652-00-86,** або на электронны адрас: **admin@ourbelarus.org.**

Зварот да беларускага народа

Людзі Беларусі!

У лістападзе 2006 года Еўрасаюз звярнуўся да беларускага народа з прапановамі па супрацоўніцтве. Былі вылучаны 12 патрабаванняў да ўлады. Прыняцце гэтых прапаноў магло стаць пачаткам вяртання нашай краіны да цывілізаванага свету, які пабудаваны на падмурку традыцыйных еўрапейскіх каштоўнасцяў — дэмакратыі, вяршынства закона і павагі да правоў чалавека.

Беларусь з’яўляецца еўрапейскай краінай, якая традыцыйна імкнулася да вышэйназваных каштоўнасцяў. Канстытуцыйны пераварот у лістападзе 1996 года гвалтоўна адарваў Беларусь ад Еўропы.

Як бачна на прыкладзе Чэхіі, Фінляндыі, Эстоніі і іншых краін, толькі еўрапейскі шлях здольны прынесці грамадзянам парадак, дабрабыт і свабоду. Лістападаўскія еўрапейскія прапановы маглі прынесці карысць усім беларусам. Але гэтыя прапановы былі адкінуты сённяшнім рэжымам, нягледзячы на тое, што ўлада мусіць быць адказнай перад сваім народам. Альтэрнатывы Еўропе ў Беларусі няма, што пацвярджаюць падзеі ганебнай нафта-газавай вайны паміж нядаўнімі найбліжэйшымі саюзнікамі — Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь. Вынікі гэтых падзей беларусы адчуюць у бліжэйшы час у сваіх сямейных бюджэтах.

Нам не трэба войнаў. Незалежнасць нашай краіны сёння мы маем таму, што ў нашага народа хапае мужных і самаахвярных людзей, здольных абараніць Беларусь. І гэта ведаюць у Маскве. Пра гэта ведае і Лукашэнка. Гарантам беларускага суверэнітэту ёсць беларускі народ. Але ў нашага народа скрадзены ўсе правы, прапісаныя ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, у тым ліку і права выбіраць уладу. Народ не скарыўся, што чарговы раз было прадэманстравана ў сакавіку 2006 г. на цэнтральнай плошчы Мінска, якую тады назвалі плошчай Кастуся Каліноўскага. Прыгадаем ягоныя словы: *“Не народ для ўраду, а ўрад для народу”.* Сёння ў Беларусі — народ для ўрада.

Нішто не замінае ўладзе зрабіць некалькі крокаў, якія маглі б палепшыць сітуацыю ў краіне:

1. Вызваліць палітвязняў.
2. Спыніць знішчэнне беларускай мовы і культуры.
3. Спыніць пераслед хрысціянскай супольнасці, адмяніць дыскрымінацыйны Закон “Аб свабодзе веравызнання”.
4. Забяспечыць у краіне свабоду слова, сходаў і мітынгаў, гарантаваных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь: ануляваць папраўкі ў Крымінальны кодэкс, якія адносяць да крымінальных злачынстваў крытыку рэжыму і аб’яднанне грамадзян у асацыяцыі.
5. Ануляваць дэкрэты, скіраваныя супраць дзейнасці і існавання дробных прадпрымальнікаў.
6. Адмовіцца ад усеагульнай кантрактнай сістэмы, якая робіць працоўных рабамі.
7. Даць свабоду дзейнасці незалежным прафсаюзам.

Пасля таго як гэтыя крокі будуць зроблены, будзе магчыма пачаць трохбаковыя перамовы паміж уладай, апазіцыяй і Еўрасаюзам з галоўнай мэтай — абарона незалежнасці Беларусі і паляпшэнне жыцця яе грамадзян.

Але без уціску з боку грамадства наша ўлада не здольная зрабіць гэтыя крокі. Беларусы, як і ўсе людзі на зямлі, мусяць патрабаваць лепшага жыцця, яны маюць на гэта права. Надзею на лепшае жыццё дае толькі шлях вяртання ў Еўропу. Усе дыктатары, фюрэры, туркменбашы — проста “чорныя дзіркі” ў гісторыі любога народу. Час іх абмежаваны.

Калі ўлады не абараняюць інтарэсы беларускага грамадства, не здольныя даць адэкватны адказ на еўрапейскія прапановы, то задача грамадства — прадэманстраваць Еўропе сваё стаўленне да гэтых прапаноў.

Павага да правоў і свабод чалавека з’яўляецца падмуркам любой дэмакратычнай супольнасці. Мы ставім за мэту прайсці першы крок еўраінтэграцыі — вяртанне Беларусі ў Парламенцкую Асамблею Савета Еўропы.

Таму мы вітаем кампанію па зборы подпісаў грамадзян Беларусі ў падтрымку прапанаванай Еўрасаюзам праграмы партнёрства і 12 умоў да беларускага ўрада, а таксама са зваротам да дэпутатаў ПАСЕ для прыняцця праграмы сумесных з грамадзянскай супольнасцю нашай краіны дзеянняў па вяртанні Рэспублікі Беларусь у Савет Еўропы.

Беларусь — у Еўропу!

Абрамовіч Аляксандр
Анташкевіч Іван
Арэстовіч Алесь
Астрэйка Яўгенія
Бураўкін Генадзь
Ваніна Таццяна
Васільеў Аляксандр
Волчак Алег
Вячорка Вінцук
Гаеўскі Алег
Гаранская Таццяна
Гарэцкая Эла
Гарэцкі Барыс
Гарэцкі Радзім
Гусак Станіслаў
Гучок Яўген
Дабравольскі Аляксандр
Дранчук Цімох
Жучкоў Аляксандр
Законнікаў Сяргей
Зарэмбюк Аляксандр
Змітровіч Анатоль
Івашкевіч Віктар
Кавалец Аляксей
Казулін Аляксандр
Казуліна Ірына
Каліта Аляксандр
Камароўскі Аляксандр
Карніенка Віктар
Кароль Ала
Кароль Аляксей
Карэтнікаў Юры
Каспяровіч Зміцер
Конан Уладзімір
Красноў Мікіта
Красоўскі Павел
Купава Мікола
Лагвінец Алесь
Леванеўскі Валеры
Леднік Ігар
Лойка Генадзь
Лукашоў Канстанцін
Лыч Леанід
Лялькоў Ігар
Ляўковіч Анатоль
Мазур Аляксандр
Макаеў Аляксандр
Макоўская Алена
Марачкін Аляксей
Маркевіч Мікола
Мельяшкевіч Юры
Мілінкевіч Аляксандр
Міхалевіч Алесь
Нікітчанка Іван
Паганяйла Гары
Панізьнік Сяргей
Раманоўскі Уладзімір
Роўда Уладзімір
Рынкевіч Ігар
Севярынец Павел
Сідарэвіч Анатоль
Сіўчык Вячаслаў
Скрабец Сяргей
Содаль Уладзімір
Станкевіч Алесь
Статкевіч Мікола
Трыгубовіч Валянціна
Фінькевіч Артур
Хадыка Юры
Хашчавацкі Юры
Хведарук Зміцер
Чарноў Віктар
Чыгір Аляксандр
Шатэрнік Аляксандр
Шаўчэнка Валерый
Шчукін Валерый
Шыдлоўская Ніна
Шыдлоўскі Алесь
Шэйн Аляксей
Якавенка Васіль
Янушэўскі Аляксей

Народная Воля http://www.nv-online.info
23 САКАВІКА 2007 г.

КАНФЛІКТ

Ці пастаўлялі беларусы ў Расію польскае мяса?

У расійска-беларускіх адносінах зноў канфлікт. На гэты раз — мясны.

Як паведаміў міністр сельскай гаспадаркі Аляксей Гардзееў, Расія мае сур'ёзныя прэтэнзіі да Беларусі па пастаўках свініны на расійскі рынак. "Калі Беларусь не зробіць дзейныя захады па спыненні нелегальных паставак і рээкспарту свініны з іншых краін, то мы будзем вымушаны ўвесці абмежаванні на ўвоз мяса з Беларусі", — паведаміў Гардзееў.

Па інфармацыі расійскага боку, кантрабандныя пастаўкі мяса з Беларусі перавысілі 40 тысяч тон, прычым амаль увесь аб'ём быў з Польшчы, імпарт з якой у Расію забаронены. Іншымі словамі, Беларусь абвінавацілі ў тым, што яна закупляла мяса ў Польшчы і пад відам свайго пастаўляла ў расійскім накірунку.

Ігар МАРОЗАЎ.

З-ЗА КРАТАЎ

Свабода за 15 мільёнаў

Маладзёжнага актывіста Дзяніса Дзянісава, які знаходзіцца ў Віцебскім СІЗА, следчы адмовіўся вызваліць да суда пад паручыцельствы вядомых асоб. Як было сказана адвакату, такое вызваленне магчыма толькі за 15 мільёнаў рублёў.

Сябры і родныя Дзяніса кінуліся шукаць грошы...

Ул.інф.

ПРЭЦЭДЭНТ

ВАЙНА мясцовага маштабу

Выбары старшыні Каладзішчанскага сельскага Савета пад бокам улады (за 30 кіламетраў ад Мінска) ператварыліся ў міжусобную вайну за сферы ўплыву паміж дэпутатамі і Мінскім райвыканкамам. Тройчы 15 дэпутатаў Савета, выбранага 14 студзеня 2007 года, абіралі старшынёй Анатоля Бурачэўскага, але тройчы Мінскі райвыканкам на чале з Міхаілам Глінскім адмаўляўся ўзгадняць гэту кандыдатуру, навязваючы Савету "свайго" стаўленіка — Алега Іванько.

Трэцяя сесія, якая прайшла 13 сакавіка, пры любым зыходзе станавілася вырашальнай для сельсавета: старшыня не абіраецца — тады Савет трэба распускаць і прызначаць новыя выбары...

На момант, пры якім канфлікт дасягнуў апагея, большасць дэпутатаў ужо прадэманстравалі цвёрдасць, прынцыповасць і намер адмовіцца ад навязваемай кандыдатуры. З другога боку ўлада не магла дазволіць такой раскошы, як праводзіць новыя выбары: гэта азначала б прызнанне, што наменклатура не маналіт, і хай сабе ў мясцовым маштабе, не поўнасцю кантралюе сітуацыю. Дадатковым фактарам (а хутчэй асноўным і вырашальным) на карысць падаўлення іншадумства стала барацьба за права распараджэння зямлёй.

Зародыш іншадумства

Каладзішчанская гісторыя пачалася не 13 сакавіка, калі праводзілася трэцяя, лёсавызначальная для сельсавета сесія, а ў дзень выбараў — 14 студзеня 2007 года.

— Яшчэ 14 студзеня ад вечара сталі вядомыя вынікі выбараў у мясцовы Савет. Як аказалася, у Каладзішчанскі сельсавет прайшлі два няўгодных уладзе дэпутаты: Міхаіл Зуенка і Вольга Кісцень. Бліжэй да поўначы (напэўна, выпраўляць сітуацыю) прыехалі старшыня раённай выбарчай камісіі Уладзімір Каралько і чалавек 10 міліцыянераў — забіраць бюлетэні. Аднак і Зуенка, і Кісцень аказаліся людзьмі дасведчанымі, парупіліся і пра падтрымку, і пра аднадумцаў, і пра назіральнікаў, і проста не дапусцілі міліцыю ў пакой, дзе захоўваліся бюлетэні, — расказвае Анатоль Бурачэўскі.

Паралельныя сюжэты

Першая сесія Каладзішчанскага сельскага Савета прайшла 2 лютага. Яшчэ да пачатку сесіі 11 дэпутатаў з 15 выбраных афіцыйна звярнуліся да старшыні Мінскага райвыканкама Міхаіла Глінскага з просьбай узгадніць кандыдатуру Анатоля Бурачэўскага на пасаду старшыні сельсавета. Адказу не атрымалі. Але на першую сесію ў Каладзішчы прыехала старшыня Мінскага раённага Савета дэпутатаў Алена Мілішкевіч, якая катэгарычна заявіла: кандыдатура А.Бурачэўскага не ўзгодненая, а райвыканкам прапануе іншага кандыдата — былога вайсковага ўрача Алега Іванько. Ніякіх тлумачэнняў наконт такога рашэння спадарыня Мілішкевіч рабіць не пажадала, таму галасаванне аказалася не на карысць вертыкалі: 10 дэпутатаў "супраць" Алега Іванько, толькі пяцёра — "за".

Вертыкаль у гэтай сітуацыі абрала курс дзеянняў па сваім разуменні, палічыўшы, што нейтралізацыя Бурачэўскага прывядзе да падаўлення ачагу супраціву. Сказана — зроблена.

5 лютага, праз два дні пасля першай сесіі, старшыня Мінскага райвыканкама Міхаіл Глінскі выдаў распараджэнне пра прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці "возмутителя спокойствия" (цытуем на мове арыгіналу): *"За низкую исполнительскую дисциплину, отсутствие должного контроля по выполнению представления прокуратуры, а также поручения райисполкома по факту самовольной постройки гражданином Катько О.Е., проживающим в п.Колодищи, объявить выговор Бурачевскому Анатолию Станиславовичу, и.о.председателя Колодищанского сельисполкома".*

Вымова была аб'яўлена за тое, што падчас снегападу ў Каладзішчах не быў прыбраны снег. У тлумачальнай запісцы А.Бурачэўскі напісаў, што таму былі аб'ектыўныя прычыны: *"засталіся толькі 200 тысяч рублёў — каб у выхадныя дні вывезці смецце, і каб не патануць цалкам у гэтым смецці".*

Але, згодна з логікай падзей, наступным днём, 16 лютага (каб жа такую аператыўнасць ды своечасова і да месца прымяняць!), выканаўца абавязкаў старшыні Каладзішчанскага сельскага выканкама Алег Іванько падпісаў загад аб звальненні Бурачэўскага з пасады намесніка старшыні з фармулёўкай *"за систематическое неисполнение служебных обязанностей".*

Начная сесія

Напярэдадні трэцяй, лёсавызначальнай сесіі, прызначанай на 13 сакавіка, прыхільнікі Анатоля Бурачэўскага абзванілі незалежных журналістаў з заклікам: *"Прыязджайце ў дзесяць раніцы ў Каладзішчы, будзе на што паглядзець!"* Аднак раённая вертыкаль, каб прадухіліць увагу мас-медыя да каладзішчанскіх падзей, зрабіла ход канём і аб'явіла тайм-аўт да 18 гадзін вечара. Гэты хітры ход, відаць, і стаў вырашальным у далейшым разгортванні падзей.

Увечары ўсе 15 дэпутатаў сабраліся ў мясцовым Доме культуры на сесію — на чарговыя выбары. Прыехаў сам Міхаіл Афанасьевіч Глінскі, разам з ім старшыня раённага Савета Алена Мілішкевіч, а яшчэ — начальнік раённай міліцыі з намеснікам, начальнік Бараўлянскай міліцыі, яшчэ нейкія людзі ў форме... (Памятаеце, як у 1995 годзе дэпутатаў апазіцыі Вярхоўнага Савета *"ахоўвалі"* спецслужбы, даахоўваўшы іх да збіцця? Вось нешта падобнае адбывалася і ў Каладзішчах.)

"Я пацікавіўся, ці ўсе злачынствы раскрыты, калі ўжо столькі міліцыі панаехала на сесію? — расказаў нам адзін з народных абраннікаў. — *Адказалі: для аховы грамадскага парадку, маўляў, дэпутаты могуць адзін аднаму морды набіць. А калі сур'ёзна, то ў нас два дэпутаты — супрацоўнікі міліцыі, і абодва выступалі супраць Іванько..."*

Вынікі трэцяга галасавання крыху змяніліся: дзевяць дэпутатаў прагаласавалі супраць Алега Іванько, шасцёра — за. І ўсё адно, для абрання гэтага не хапала. *"Пасля аб'яўлення вынікаў падымаецца Глінскі і кажа: вы будзеце галасаваць хоць да раніцы — мне без розніцы, але не выйдзеце адсюль да таго часу, пакуль не прагаласуеце за Іванько,* — расказвае Анатоль Бурачэўскі. — *Іванько і яго новая намесніца Ліпай загадалі рыхтаваць новыя бюлетэні для галасавання. Я падняўся і кажу: "Даруйце, паступіла прапанова закрыць сесію".* Мне проста закрываюць рот, але перапынак аб'явілі.

Шэсць дэпутатаў з пятнаццаці, нязгодныя з сілавымі метадамі, проста сышлі з сесіі. Потым яшчэ адзін, падумаўшы, пакінуў залу. Па рэгламенце нашага Савета сесія лічыцца правамоцнай, калі на ёй прысутнічаюць дзве трэці ад агульнай колькасці дэпутатаў, гэта значыць 10 чалавек з 15-ці. А засталося восем... Але, не засмуціўшыся, рэштку дэпутатаў *"дадавілі"* на тое, каб змяніць рэгламент (каб сесія лічылася правамоцнай, калі на ёй прысутнічае палова дэпутатаў плюс адзін голас) і, нарэшце, выбраць старшынёй Іванько".

Звальненне заднім чыслом

Каб звольніць намесніка старшыні Савета, патрабуецца дазвол гэтага самага Савета. На Анатоля Бурачэўскага правіла не распаўсюдзілі. Яго звольнілі 16 лютага і толькі 13 сакавіка пытанне было вынесена на сесію Каладзішчанскага сельскага Савета. Заднім чыслом, прычым на непаўнамоцную сесію... Але што ж тут засмучацца, галоўнае, каб было адзінагалоснае галасаванне!

"Пяць дэпутатаў прагаласавалі за маё звальненне, трое — супраць. Пытанне тройчы ставілася на галасаванне, і тройчы вынік заставаўся нязменным. Маўляў, за Іванько заставілі прагаласаваць, але Бурачэўскага звальняць няма за што..."

Пошукі праўды

14 сакавіка сямёра дэпутатаў Каладзішчанскага сельскага Савета падалі заяву ў Мінскую міжраённую пракуратуру, палічыўшы незаконнай праведзеную напярэдадні сесію і адпаведна прынятыя на ёй рашэнні. Дэпутаты налічылі шэсць парушэнняў заканадаўства і папрасілі пракуратуру прызнаць сесію незаконнай і несапраўднай. Вынікаў разбіральніцтва пакуль няма.

"Я на 90 працэнтаў перакананы, што сесію прызнаюць законнай. Знойдуць, як звычайна, мільён адгаворак. Таблічкі ўжо зменены: на дзвярах кабінета стыршыні ўжо вісіць таблічка "Алег Іванько", мяркую, райвыканкам заключыў з ім працоўны кантракт. Пра парушэнні мы пісалі пасля другой сесіі: і ў Палату прадстаўнікоў, і ў Савет Рэспублікі, і ў Камітэт дзяржкантролю, і ў пракуратуру, і ў прэзідэнцкую Адміністрацыю. Адказ адзін: вашы запыты знаходзяцца на разглядзе ў Мінскім аблвыканкаме, а Мінскі аблвыканкам у сваю чаргу спускае ўсё ў Мінскі райвыканкам", — канстатуе А.Бурачэўскі.

Ад супрацоўніка міліцыі, які пакінуў сесію 13 сакавіка, начальства патрабуе падаць рапарт на звальненне. Дэпутат адмовіўся, але начальства паабяцала на працягу месяца звольніць — калі не звольніцца самастойна...

5 сакавіка Анатоль Бурачэўскі падаў іск на незаконнасць звальнення ў Мінскі раённы суд. *"Я спадзяюся на справядлівасць суда — толькі для таго, каб прыйсці і напісаць заяву на звальненне самастойна",* — адзначыў А.Бурачэўскі.

Першапрычына

Па неафіцыйнай інфармацыі, калі гаварыць пра блізкія да Мінска землі, толькі тут, на тэрыторыі Каладзішчанскага сельскага Савета, засталася *"вольная"* зямля. А зямля сёння — самы хадавы і прыбыткавы тавар. Распараджэнне зямлёй знаходзіцца ў юрысдыкцыі сельскага Савета, але дэ-факта — у руках старшыні сельсавета. Зразумела, што, маючы *"свайго"* старшыню сельсавета, можна вырашаць зямельныя праблемы *"як трэба".*

Каладзішчанскі сельскі Савет — адзін з буйнейшых у Мінскім раёне, які аб'ядноўвае восем населеных пунктаў. *"Вольная"* зямля ў Каладзішчах засталася ад ваеннага палігона, які раней належаў Міністэрству абароны. Акрамя таго, тут яшчэ нават не пачыналі забіраць зямельныя ўчасткі (як прадпісвае прэзідэнцкі ўказ), дзе няма пабудоў ці відавочны даўгабуд. А каштуюць такія ўчасткі дорага і попыт на іх вялікі! Так, летась па Каладзішчанскім сельскім Савеце зарэгістравана каля 500 дагавораў *"куплі-продажу"* зямельных участкаў, найгоршыя прадаваліся недзе па 5 тысяч долараў, сярэдненькія — каля 10 тысяч, лепшыя — пад 20 тысяч долараў. Сёлета, адпаведна з новымі расцэнкамі, зямля можа падаражэць аж у 30 разоў. Не будзем забывацца і пра тое, што менавіта тут будзе будавацца новы комплекс гольф-клуба з пяцізоркавым атэлем, што аўтаматычна ўздымае кошт зямлі да астранамічных лічбаў. Ці не з-за гэтага такая ўвага да сельсавета?..

Дарэчы, зямельныя скандалы не абмінулі Калодзішчы. Увосень 2006 года Мінская абласная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу ў адносінах да былога старшыні Каладзішчанскага сельскага Савета Таццяны Бонда па артыкуле 126 Крымінальнага кодэкса — "Перавышэнне ўлады і службовых абавязкаў". Экс-старшыня *"парадзіла"* каля 100 зямельных участкаў *"двайнога"* ўладання: калі адным і тым жа зямельным участкам валодаюць два абсалютна розныя чалавекі. Крымінальная справа расследуецца Мінскай абласной пракуратурай...

Генрых СТАХОЎСКІ.

Анатоль Бурачэўскі. Тройчы дэпутаты Каладзішчанскага сельсавета абіралі яго старшынёй Савета, аднак кіраўніцтва Мінскага райвыканкама зрабіла усё, каб саветам кіраваў "свой" чалавек. Што ж, дэмакратыя па-беларуску.

ОТОВСЮДУ

Шейман улетел к Уго Чавесу

Правительственная делегация Беларуси во главе с Государственным секретарем Совета безопасности Виктором Шейманом направилась в Венесуэлу. К Дню Воли, 25 марта, главный силовик страны должен вернуться.

В ходе визита запланированы переговоры Виктора Шеймана с президентом Венесуэлы Уго Чавесом и другими высшими должностными лицами. Официально сообщается, что предмет переговоров — проекты в области энергетики. Однако по кулуарам белорусской власти упорно ходят слухи, что в конце марта — начале апреля Виктор Шейман может быть назначен послом Беларуси в Венесуэле.

Мест нет

Как сообщает "Интерфакс", Министерство образования Беларуси приняло решение сократить в этом году прием студентов на бюджетную форму обучения.

Согласно утвержденным контрольным цифрам, прием будет сокращен на 700 человек.

Аварийная посадка

В поле у деревни Остромечево Брестского района, поломав амортизаторы колесных шасси, совершил аварийную посадку самолет Ан-2.

Два летчика РУПП "Авиакомпания "Гродно" вели сельскохозяйственную обработку пашни, когда в самолете загорелся двигатель. Огню не дала распространиться сработавшая автоматическая противопожарная система. Посадив крылатую машину в не совсем удобном для приземления месте, авиаторы погасили пламя ручными огнетушителями. К счастью, никто из них не пострадал.

Суд защитил учительницу от учеников

Хулиганская выходка двух учащихся добрушской городской школы №2 в отношении учительницы закончилась для них обвинительным приговором. Районный суд первой инстанции приговорил 15-летних подростков к наказанию в виде лишения свободы в воспитательной колонии.

Как мы уже сообщали, инцидент произошел в ноябре минувшего года во время урока, когда после единиц, выставленных ученикам по предмету 25-летней учительницей русского языка и литературы, они стали заламывать ей руки и бить по ногам.

Изучив материалы дела, суд первой инстанции признал подростков виновными в совершении преступления. Один из обвиняемых приговорен к 3 годам 1 месяцу лишения свободы, второй получил 1 год 1 месяц.

По материалам информагентств.

ПОДРОБНОСТИ

Кто возглавит «Трансавиа-экспорт»?

На минувшей неделе в компании "Трансавиа-экспорт" совершенно неожиданно поменялось руководство — гендиректор Олег Рыжиков (на фото) попрощался со своей должностью.

Теперь обязанности гендиректора временно исполняет бывший заместитель Рыжикова **Георгий Егиазарян.**

"Уход Рыжикова абсолютно не связан с тем, что недавно случилось в Сомали, — рассказал "Народной воле" Георгий Анушаванович. — *Просто эти два события — обстрел самолета и отставка Рыжикова — неожиданно совпали. Хотя я точно знаю: гендиректор написал заявление об уходе уже давно, но приказ министра появился именно сейчас..."*

Сотрудники "Трансавиаэкспорта" говорят, что Рыжиков просто решил сменить место работы. Однако куда именно он уходит и почему — точно неизвестно.

Сам Рыжиков от каких-либо комментариев пока воздерживается.

Бывший руководитель "Трансавиаэкспорта" генерал-лейтенант авиации **Владимир Мещеряков** не исключает, что Рыжикова могли попросить уйти.

"Мне в свое время тоже предлагали уйти, тоже предлагали написать заявление об уходе по собственному желанию, а взамен обещали высокую должность, — вспоминает Владимир Николаевич. — *Я отказался. Меня убрали из "Трансавиаэкспорта" потому, что по натуре я — государственник. И все делал прежде всего в интересах государства. Но некоторым это не нравилось. Против меня сфабриковали несколько дел и таким образом убрали из компании..."*

Георгий Егиазарян надеется, что исполнять обязанности главы "Трансавиаэкспорта" будет недолго.

"Я не принимаю ни поздравлений, ни соболезнований, — говорит он. — *Надеюсь, это все очень временно".*

Как сообщили "Народной воле" в Министерстве транспорта и коммуникаций Беларуси, конкретная кандидатура на место Рыжикова уже есть. Однако имя этого человека не называют.

"Пока это закрытая информация, — говорят в министерстве. — *Сейчас эта кандидатура проходит процедуру согласования. Но эта процедура — чрезвычайно сложная, она может затянуться и на полгода".*

Не исключено, что кандидатура нового гендиректора будет согласовываться с высшим руководством страны.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Владимир ЛАДНОВ: «Только идиоты могут ничего не бояться...»

На минувшей неделе летчики "Трансавиаэкспорта", самолет которых обстреляли в Сомали из ручного гранатомета или переносного зенитно-ракетного комплекса, вернулись в Минск.

Большая часть экипажа ИЛ-76 живет в Витебске. Как сообщали официальные источники, сразу по прилету из Африки летчиков хотели отправить на реабилитацию. Однако они изъявили желание хотя бы несколько дней провести со своими родными и близкими, отдохнуть, а уж потом отправиться на медкомиссию и реабилитационные процедуры.

Звонок "Народной воли" застал командира экипажа ИЛ-76 **Владимира Ладнова** как раз по дороге в Витебск.

— *Владимир Георгиевич, Вы очень опытный пилот. Бывали в Афганистане, в Африке. Страшно было, когда самолет обстреляли?*

— *Я не могу даже сказать, какие чувства мы испытали и что нам пришлось пережить... Только идиоты могут ничего не бояться...*

В компании "Трансавиаэкспорт" говорят, что пока экипаж не готов общаться с прессой — им надо отдохнуть.

Марина КОКТЫШ.

ДЛЯ СПРАВКИ

Республиканское унитарное предприятие "Авиакомпания Трансавиаэкспорт" создано в 1993 году. Занимается перевозкой грузов в страны СНГ и дальнее зарубежье.

Всего в парке авиакомпании насчитывается более двадцати воздушных судов ИЛ-76ТД, способных перевозить самые разнообразные виды грузов.

Авиакомпания имеет лицензию на перевозки различных грузов, включая специальные и опасные.

ТАМ, ЗА КРАТАМІ

Казуліну забаранілі шпацыраваць па «алеі Казуліна»

Адвакат Ігар Рынкевіч у чарговы раз наведаў свайго падабароннага ў калоніі "Віцьба-3".

— Знешне Казулін выглядае значна лепш, — як звычайна, пра падрабязнасці чарговай сустрэчы Ігар Рынкевіч расказаў "Народнай волі". — Яшчэ на пачатку сакавіка важыў 86 кг, але больш вагі не набірае. Родным Казуліна, як вядома, забаранілі перадаваць прадукты ў калонію, таму што асобы рэжым харчавання (так званы выхад з галадоўкі) адменены. Цяпер Казулін мусіць харчавацца ў сталоўцы, яму прапісаны дыетычны стол 5Б. Але ад казённай ежы Казулін адмаўляецца.

Між іншым, я атрымаў адказ ад адміністрацыі калоніі на свой запыт адносна здароўя Казуліна і магчымых канфліктаў паміж асуджанымі з удзелам Аляксандра Уладзіслававіча.

Што тычыцца здароўя, то на гэтае пытанне адказаў начальнік медсанчасці калоніі. Адказ скупы: Казулін быў абследаваны, пульс нармальны, вага 86 кг... Праўда, быў пастаўлены дыягназ астэнія, таму экс-кандыдату ў прэзідэнты і рэкамендавалі дыетычнае харчаванне. Я звярнуў увагу на тое, што ў адносінах да Казуліна быў праведзены толькі знешні медыцынскі нагляд. Казуліну не рабілі ультрагукавое абследаванне, не рабілі больш падрабязны аналіз крыві, напрыклад, біяхімічны... Ці можна цалкам давяраць такому "абследаванню"?..

Што тычыцца адносін Казуліна з іншымі асуджанымі, то гэтую інфармацыю мне прадаставіў начальнік аператыўнай часці. У ёй сцвярджаецца, што канфліктаў паміж асуджанымі на бытавой глебе з удзелам Казуліна не назіраецца.

Аднак, на думку самога Аляксандра Уладзіслававіча, спрыяльнай сітуацыя выглядае толькі знешне. Ён расказаў, што траіх асуджаных, якія мелі з ім найбольш актыўныя зносіны, перавялі ў іншыя калоніі, хаця гэта робіцца ў выключных сітуацыях. Прычым адзін з іх быў з высокай тэмпературай, але і гэтая акалічнасць не перашкодзіла высяліць яго з "Віцьбы-3". Для чаго гэта робіцца? Каб стварыць вакол Казуліна своеасаблівы вакуум: двое з пераведзеных мелі вышэйшую адукацыю, што ў калоніі з'ява не частая. Іншыя асуджаныя баяцца размаўляць з Казуліным, таму што іх могуць пазбавіць заахвочванняў, ёсць небяспека не атрымаць датэрміновае вызваленне. Аляксандра Уладзіслававіча проста ізалююць.

У калоніі была праславутая "алея Казуліна", аднак цяпер Аляксандру Казуліну забаранілі па ёй шпацыраваць, адвялі для прагулак маленькую плошчу. Больш таго, знялі кармушку, у якую Казулін кідаў хлебныя крошкі для галубоў. Кармушку знялі на падставе пагрозы птушынага грыпу. Аднак асуджаныя адразу адрэагавалі на гэты факт: ад Казуліна не толькі людзей ізалявалі, але яшчэ і птушак.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
23 САКАВІКА 2007 г.

ОФИЦИАЛЬНО

В Беларуси средняя зарплата бюджетников снизилась на 13%

В Беларуси в отраслях бюджетной сферы среднемесячная заработная плата в январе 2007 года составила 535 тысяч рублей. Как сообщили БЕЛТА в Министерстве статистики и анализа, этот показатель уменьшился по сравнению с декабрем 2006 года на 80 тысяч рублей, или на 13%.

В учреждениях здравоохранения средняя зарплата в январе сложилась в размере 511 тысяч рублей, в том числе врачей — 893 тысячи, среднего медицинского персонала — 501 тысячу, младшего медицинского персонала — 306 тысяч рублей.

Средняя зарплата в учреждениях образования составила 497 тысяч рублей, в том числе учителей — 617 тысяч, профессорско-преподавательского состава — 906 тысяч рублей.

Самые низкие заработки были в организациях культуры и искусства. Средний показатель составляет 481 тысячу рублей, в том числе у библиотекарей 374 тысячи, артистов — 621 тысяча рублей. По статистическим данным, у работников организаций физкультуры и спорта заработок выше среднего: в январе он составил 739 тысяч рублей.

А теперь сравните: на сколько за этот же период выросли цены?..

СІТУАЦЫЯ

Ліквідатары патрабуюць па 100 тысяч еўра кожнаму

Днямі у Калінкавічах каля мясцовай пошты сабралося паўтара дзесятка былых афіцэраў запасу, якія ў 1986—1989 гадах праз ваенкаматы былі прызваныя на службу і пра цу ў Чарнобыльскай зоне. Сустрэча адбывалася на вуліцы, паколькі мясцовы раённы камісар Генадзь Галеня адмовіўся прадаставіць памяшканне, спаслаўшыся на забарону вышэйшага вайсковага начальства.

Вайсковыя ліквідатары ўхвалілі зварот да ўрада Рэспублікі Беларусь, у якім патрабуюць узамен ільгот, прадугледжаных законам "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай атамнай станцыі", кампенсацыю ў памеры 100 тысяч еўра кожнаму. Пра гэта карэспандэнту БелаПАН паведаміў былы ліквідатар, інвалід II групы Васіль Сіліверст з Калінкавіч.

Такое патрабаванне выстаўлена з прычыны таго, што смяротнасць і інваліднасць у вайсковых ліквідатараў сярод іншых груп рызыкі самая высокая. Да таго ж змены ў "чарнобыльскім" законе зроблены так, што на дапамогу з боку дзяржавы можа спадзявацца вельмі мала пацярпелых, лічаць ліквідатары.

Зварот да ўрада Беларусі падтрымалі і вайсковыя ліквідатары Мазыра.

Анатоль ГАТОЎЧЫЦ.

ЗНАКОМЬТЕСЬ

«Теперь в Фаниполе новый градоначальник, хотя, как вы понимаете, пока это не я»

После выборов в местные Советы прошло два месяца. Напомним, что многие называли кампанию бессмысленной, говорили, что в нынешних белорусских условиях демократы просто не могут получить мандаты. И все-таки 25-летний Александр Золотар в своем округе победил. На выборах в Фанипольский городской Совет депутатов он одержал победу и стал единственным представителем Объединенной гражданской партии, которому удалось пробиться в органы местной власти.



— Александр, еще раз примите наши поздравления, Вы совершили поистине невозможное. А сами Вы верили, что удастся победить?

— Я твердо верил, что стану депутатом. Ведь если не верить в победу, то зачем вообще участвовать в выборах? Если участвовать в избирательной кампании с мыслями о невозможности победы, то избиратель тебе никогда не поверит. Люди не будут за вас голосовать, если не увидят в ваших глазах уверенности в своих силах.

— И все-таки прошедшую кампанию называют беспрецедентной по тому давлению, которую оказывали власти на независимых кандидатов…

— То, что честных и справедливых выборов не будет и что независимым кандидатам выиграть практически невозможно, было понятно сразу. В нашем городе во всех округах было по одному кандидату-демократу, и против них власть выставила своих сильных конкурентов. Против меня, например, был выставлен известный руководитель жилищно-коммунальной службы, который уже многократно избирался в городской Совет. Думаю, власти не ждали никаких сюрпризов, полностью надеясь на административный ресурс, и это сыграло злую шутку. Никакой активности нашего кандидата от власти заметно не было. А я, напротив, вел очень активную кампанию: мы обошли все квартиры, по нескольку раз встречались и беседовали с людьми, раздавали информационные материалы... Видя это, "проснулся" и мой соперник, на дверях подъездов появились листики с его краткой биографической справкой. Многие избиратели такое внимание к себе восприняли просто как оскорбление.

Мы понимали, что главная задача — это убедить людей не ходить на досрочное голосование, потому что именно здесь (по опыту других кампаний) совершаются основные фальсификации. Досрочное голосование я, кстати, проиграл, но благодаря проведенной разъяснительной работе процент досрочной явки по нашему округу был невысок.

— И все-таки, как Вам, молодому парню, в отличие от всех остальных, более опытных однопартийцев удалось победить?

— В первую очередь помогло знание местных проблем и мой авторитет среди населения округа. Во-вторых, избирателей в малых городах можно завоевать только вниманием, которым они не избалованы, и индивидуальным подходом к каждому. В-третьих, грамотно организованная работа доверенных лиц и четкое наблюдение на избирательном участке. Вся моя команда работала на результат.

— Что же Вы обещали людям?

— Я реально понимал, что несерьезно обещать решить глобальные проблемы, это просто не входит в компетенцию депутата городского Совета, над которым еще районный и областной Советы. И в этой связи меня очень веселило, когда читал программы "обязательных" депутатов, в которых они обещали "повысить уровень жизни населения", — люди, видимо, вообще не понимали, куда идут. В моей программе основной упор был сделан на необходимость пересмотра районного бюджета. Фаниполь дает в бюджет Дзержинского района около 70% всех поступлений, а после перераспределения средств на нужды нашего города перепадает лишь 10%. И именно этот денежный дефицит не позволяет навести порядок в городском здравоохранении, жилищно-коммунальном хозяйстве, строительстве дорог и домов, организации досуга и прочего. Я предложил инициировать пересмотр статуса Фаниполя, предложил сделать его городом областного подчинения. Моя предвыборная программа была одобрена и поддержана избирателями, за что я им всем говорю огромное спасибо. Понимаю, что в одиночку мне будет сложно решить эти вопросы, но я постараюсь среди депутатов найти единомышленников и сделаю все возможное, чтобы мои обещания не остались просто обещаниями.

— Уже прошло несколько сессий. Как впечатления, какие вопросы решались?

— На первых сессиях всегда решаются кадровые вопросы: либо утверждают старого председателя, и тогда все проходит быстро, либо назначают нового, и в этом случае возможна интрига. В нашем случае судьба действующего председателя горисполкома была решена в момент моей победы на выборах. Теперь в Фаниполе новый градоначальник, хотя, как вы понимаете, пока это не я. *(Смеется.)*

— Что бы Вы посоветовали тем коллегам по демократическому лагерю, для которых выборы закончились поражением?

— Все равно надо бороться. Это не последние выборы, и к следующим выборам надо начинать готовиться уже сегодня. Не секрет ведь, что многие живут от кампании до кампании — просыпаются в последний момент, а потом все проблемы сваливают на режим.

— Теперь к Вам вопрос не как к депутату, а как к члену Объединенной гражданской партии. Как Вы относитесь к планируемой 25 марта политической акции на Октябрьской площади? Говорят, депутатов-демократов вообще вывозят из страны на это время на какую-то учебу.

— От этой поездки я отказался, поскольку, как и все сознательные люди, считаю своим долгом в этот день быть на площади. Но по организации этой акции у меня есть замечания. Наблюдается полное отсутствие информационных материалов и несогласованность действий демократов. Я не понимаю, для чего проводилось большое число мелких мероприятий в канун главного события: таких как митинг предпринимателей на площади Бангалор, молодежная акция на Октябрьской площади, многолюдные зарубежные семинары... Я не понимаю такого распыления сил и средств. Считаю, что надо ставить цель и всем вместе, единой колонной, идти к этой цели. Это касается и Дня воли, и нашей главной цели и главной победы.

Елена НОВИКОВА.

ВАС ЦІКАВІЦЬ…

*Некалі на ўсю Беларусь грымеў сваімі высокімі паказчыкамі калгас "Аснежыцкі" Пінскага раёна. У апошнія гады ўсё гучней і гучней гаворыць пра поспехі агракамбіната **"Сноў"**, што ў Нясвіжскім раёне. Скажыце, калі ласка, колькі надойваюць малака ад каровы ў гэтай гаспадарцы?*

Марыя КУЗЬМІЦКАЯ, пенсіянерка.

Ад кожнай з 2000 кароў — па 8201 кілаграму малака

Калі верыць справаздачным дакументам, то за мінулы год у агракамбінаце "Сноў" надаілі ад 2000 кароў у сярэднім па 8201 кілаграму малака.

Заўважым, рэкорд па прадуктыўнасці малочнага статку ўсё ж не за гэтай гаспадаркай. У КСУП "Брылёва" ад кожнай з 300 кароў за мінулы год надаілі па 8627 кілаграмаў малака.

Займаюцца прыпіскамі ў гэтых гаспадарках ці не — пытанне, як кажуць, для рэвізораў. "Народная воля" прывяла лічбы, якія занатаваны ў афіцыйных справаздачах.

ЧУЛІ?

Для ўключэння ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА збіраецца дасье адразу па некалькіх беларускіх аб'ектах

У першую чаргу размова ідзе пра фартыфікацыйныя збудаванні Брэсцкай крэпасці і комплекс помнікаў архітэктуры XII-XIX стагоддзяў Полацка.

Адначасова спецыялісты збіраюць інфармацыю аб культавых збудаваннях Беларусі абарончага тыпу, драўлянага дойлідства Беларускага Палесся. Таксама прэтэндуе на ўключэнне у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ансамбль праспекта Незалежнасці ў Мінску — участак ад плошчы Незалежнасці да вуліцы Казлова, які прадстаўляе традыцыю пасляваеннай савецкай архітэктуры. Усяго ў спісе намінацый ад Беларусі, падтрыманых Цэнтрам сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, 10 аб'ектаў.

Нагадаем, што статус аб'ектаў Спісу сусветнай спадчыны ЮНЕСКА нададзены Белавежскай пушчы (1979 г.), замкаваму комплексу ў Міры (2000 г.), архітэктурна-культурнаму комплексу Радзівілаў у Нясвіжы (2005 г.), трансгранічнаму аб'екту "Геадэзічная дуга Струве" (2005 г.). У канчатковай стадыі знаходзіцца работа над дасье па трансгранічным (беларуска-польскім) аб'екце "Аўгустоўскі канал".

Ул.інф.

Алесь ПЕТРАШКЕВІЧ

«Приласкать и уничтожить!»

Гістарычная трагедыя

Збалелыя беларускія грудзі выбухнулі на ўвесь свет нясцерпна грымотнае "НЕ" — нявольніцтву, гвалту, халопству.

Аляксей Каўка

Дзейныя асобы

ЛУЦКЕВІЧ Антон Іванавіч — беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, гісторык, публіцыст, літаратурны крытык, 33 гады.

ЛЁСІК Язэп Юр'евіч — беларускі грамадскі дзеяч, мовазнавец, пісьменнік, педагог, 34 гады.

СКІРМУНТ Раман Аляксандравіч — беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, 39 гадоў.

ГАРУН Алесь (Прушынскі Аляксандр Уладзіміравіч) — паэт, дзеяч беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, 30 гадоў.

СМОЛІЧ Аркадзь Антонавіч — дзеяч беларуска-дзяржаўнага адраджэння, педагог, 26 гадоў.

ЕЗАВІТАЎ Канстанцін Барысавіч — дзеяч беларускага нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння — гісторык, публіцыст, перакладчык, 24 гады.

КРАЎЦОЎ Макар (Касцевіч Макар Мацвеевіч) — дзеяч беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, паэт, 26 гадоў.

РАК-МІХАЙЛОЎСКІ Сымон Аляксандравіч — беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, публіцыст, педагог, 33 гады.

ВАРОНКА Язэп Якаўлевіч — беларускі палітычны дзеяч, публіцыст, журналіст, 26 гадоў.

БАДУНОВА Палута Аляксандраўна — дзеяч беларускага нацыянальнага руху, педагог, 32 гады.

ГРЫБ Тамаш Тамашавіч — беларускі палітычны і культурны дзеяч, 22 гады.

СЕРАДА Іван Мікітавіч — дзеяч беларускага нацыянальнага руху, 38 гадоў.

ЗАХАРКА Васіль Іванавіч — беларускі палітычны дзеяч, 40 гадоў.

ШАНТЫР Фабіян Гіляравіч — беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, паэт, публіцыст, 30 гадоў.

ФАЛЬСКІ Усевалад Сцяпанавіч — беларускі грамадска-палітычны і культурны дзеяч, 31 год.

СІВІЦКАЯ Людвіка Антонаўна (Зоська Верас) — беларуская грамадска-культурная дзяячка, пісьменніца, 25 гадоў.

Дэлегат КУЗЬМА — селянін, гадоў 50.

ГОЛЬМАН Міхаіл Барысавіч — прапаршчык, удзельнік рэвалюцыйнага руху на Беларусі ў 1917 г., эсэр, 23 гады.

МЯСНІКОЎ (Мяснікян) Аляксандр Фёдаравіч — прапаршчык, в. а. Вярхоўнага галоўнакамандуючага Заходнім фронтам, 31 год.

ЛАНДАР Карл Іванавіч — Старшыня СНК Заходняй вобласці і фронту, 34 гады.

РЭЗАЎСКІ Людвіг Пятровіч — камісар унутраных спраў Заходняй вобласці і фронту, 30 гадоў.

РАМНЁЎ — чырвоны камандзір, 25 гадоў; турэмшчык, 50 гадоў.

Дзея трэцяя VIII

Гісторык. 21 лютага 1918 года Выканаўчы камітэт Рады, выконваючы волю Усебеларускага з'езда, аб'явіў сябе вышэйшай уладай у Беларусі, вылучыў са свайго складу першы беларускі ўрад на чале з Язэпам Варонкам і паабяцаў хуткае скліканне Усебеларускага ўстаноўчага сходу. Узнавілася дзейнасць гарадской думы. На супрацоўніцтва з новым урадам пагадзіліся вядомыя земскія дзеячы. Але самастойнай дзяржаўнай дзейнасцю беларусы займаліся нядоўга. Газета "Белорусская земля" ці то з іроніяй, ці то з жалем адзначыла: *"Белорусский народ может смело вписать в свою многовековую историю прекраснейшую идиллию о белорусском правительстве, существовавшем пять дней. Этого нельзя не воспринять с жаром в сердце, ибо это была действительность из мечты, это был апогей белорусского национально-политического возрождения".*

25 лютага ў Мінску запанавалі немцы. Камандуючы 10-й нямецкай арміяй генерал Эрых фон Фалькенхайн беларускай улады не прызнаў, але дзейнасць яе не забараняў. Абрабаваную салдатнёй дзяржаўную казну Народнаму сакратарыяту вярнуў, але на перамовы з ім не даваўся. Пры сустрэчы з урадавай дэлегацыяй працытаваў са Святога Дабравесця паводле Лукаша: *"І я кажу вам: прасеце, і дасца вам, шукайце, і знойдзеце, стукайцеся, і адчыніцца вам: бо кожны просьбіт атрымлівае, і шукальнік знаходзіць, і хто стукаецца, таму адчыняць".*

Гэтую параду ўрадаўцы выкарысталі напоўніцу. Афіцыйна не прызнаны ўрад тым не менш атрымаў магчымасць распачаць не толькі шырокую культурную, але і нарматыўную дзейнасць ды ратаваў Беларусь, якую сумежныя дзяржавы расцягвалі на кавалкі.

Найперш 9 сакавіка Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда ў адказ на Брэсцкую мірную дамову, якая дзяліла Беларусь паміж Расіяй і Германіяй, выдае Другую Устаўную Грамату да народаў Беларусі, якая з'яўляецца канстытуцыйнай і па сваім дэмакратызме становіцца вышэй за канстытуцыю савецкай Расіі. Гэтай граматай і было дэкларавана ўтварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, да стварэння якой немцы ніякага дачынення не мелі, як і да яе дзяржаўных структур. І Выканаўчы камітэт Рады, кіруемы Беларускай сацыялістычнай грамадой, прымае рашэнне ісці ў дзяржаўным будаўніцтве далей і супольна з Віленскай Беларускай Радай...

Сцэна асвятляецца.

У пакоі Гарун, Лёсік, Смоліч, Захарка і Варонка. Нарада паплечнікаў-аднадумцаў крыху паспешлівая, таму і нервовая, напружаная.

Смоліч. Я даўно кажу: у нас адна доля з Украінай. Яна, канешне, апярэдзіла нас у стварэнні незалежнай Рэспублікі, але ж дарога ў нас адна! Сённяшні дзень Украіны — гэта наша заўтра. Украіна зараз у авангардзе нацыянальнага руху. А некалі, як і мы, імкнулася да федэрацыі з Расеяй. Але ж часы мяняюцца, і момантаў упускаць нельга. На каго ставіць? А ні на каго! Немцы нас да пары церпяць... Ды сэрца маё да іх не ляжыць, як і да палякаў, што мяжу сваю бачаць за Смаленскам. Пра Расею і казаць нічога не хачу....

Варонка. Даліся табе гэтыя немцы! Немцы як немцы... Мы прыглядаліся да акупантаў, акупанты прыглядаліся да нас.

Лёсік. І моўчкі... Пакуль не сутыкнуліся з палітычным органам у асобе Рады з'езда, а цяпер яшчэ і Народнага сакратарыята...

Гарун. Калі ў першы дзень свайго гаспадарання выкінулі нас з памяшкання і сцяг з будынка сарвалі ды дзяржаўную казну сканфіскавалі, то пасля ж вярнулі і амаль павініліся...

Смоліч. У тым і справа, што амаль...

Варонка. А ты чаго хацеў?

Смоліч. Нічога я ад іх не хачу. Зразумець не магу, як і чаму яны моўчкі сцярпелі абвяшчэнне БНР? Нібы нічога і не здарылася! А як аб'явім незалежнасць?!.

Лёсік. Пра незалежнасць першым Макар Краўцоў сказаў вунь калі... І яе трэба каваць, пакуль не астыла...

Смоліч. Як сябе трымаў Фалькенхайн пры перамовах?

Варонка. Звычайна. Гутарка доўжылася больш за дзве гадзіны пры поўнай лаяльнасці генерала. Былі закрануты самыя розныя бакі становішча на Беларусі. Мне падалося, што немцы ведаюць становішча ў Менску і краі намнога лепш, чым мы думаем. Гаворка вялася ў рэчышчы менавіта дзяржаўнага ўладкавання Беларусі. Што да непаразуменняў і наскокаў на нас, то іх Фалькенхайн патлумачыў непаразуменнямі, якія мелі месца па прычыне лжывых прадузятых даносаў і абвінавачанняў беларускіх дзеячаў у бальшавізме.

Смоліч. Гэта абнадзейвае, і мы дапускаем прыняцце Трэцяй Устаўной граматы, якой і аб'яўляем Беларускую Народную Рэспубліку незалежнай дзяржавай. Так?

Гарун. Калі Фалькенхайн і гэта сцерпіць, будзем чакаць, што Берлін першым прызнае незалежную БНР.

Лёсік. У нямецкай акупацыйнай палітыцы ў адносінах да нашай БНР праглядаюцца дзве лініі — як на ўзроўні дзяржаўным, так і канкрэтным, мясцовым. З аднаго боку — непрызнанне БНР афіцыйным Берлінам. З другога — падтрымка яе праз Х нямецкую армію і асабіста яе камандуючага, які ў адносінах з намі, як мне здаецца, заходзіць даволі далёка.

Гарун. Ведаць бы, што за гэтым стаіць...

Смоліч. Што б ні стаяла, ідзем на незалежную Беларускую Народную Рэспубліку!..

Лёсік. Больш прыдатнага моманту бадай што не будзе...

Смоліч. Значыць, згода!

Варонка і **Гарун** *(амаль разам).* Згода!

Смоліч. Вільні, Віленшчыне, асабіста Луцкевічу, а ён з хвіліны на хвіліну будзе тут, ставім умову: адмовіцца ад ідэі стварэння Беларуска-Літоўскай дзяржавы і разам з намі ісці і на незалежнасць БНР і на аб'яднанне Беларусі ў яе этнаграфічных межах.

Лёсік. Варта прыкінуць, хто на Радзе нас падтрымае, а хто будзе супраць.

Смоліч. Па палітычнай прыналежнасці бальшыня Рады належыць да Грамады.

Гарун. Меншавікі, жыдоўскія і польскія партыі правасацыялістычнай арыентацыі ідэю незалежнасці не падтрымаюць, гэта безумоўна.

Варонка. Пасля прыняцця Другой Устаўной грамады і пракламавання БНР эсэры ад меншавікоў адкалоліся і хістануліся ў наш бок. А ў сваёй газеце заявілі *(зачытвае)*: "Всебелорусское Учредительное собрание и все подготовленные к нему шаги должны встретить на местах у наших товарищей социалистов-революционеров самую решительную и энергичную поддержку, и мы, социалисты-революционеры, должны принять в делах Белорусской Республики самое деятельное участие, внося в молодое и слабое еще белорусское движение свой опыт и все свои силы и знания".

Смоліч. Я не веру эсэрам...

Гарун. І дарэмна. Гэта ж нашы эсэры, а не расейскія.

Смоліч. Не бачу розніцы з расейскімі...

Уваходзіць Луцкевіч.

Луцкевіч. Маё шанаванне грамадзе і грамадоўцам. *(Са Смолічам абдымаецца, з іншымі здароўкаецца за руку.)* Я ведаю, што Беларуская Рада ўжо ў зборы. І тым не менш некалькі слоў у вузкім коле, каб былі зразумелыя і мой прыезд, і мая рашучасць. Зусім нядаўна мы правялі беларускую канферэнцыю ў Вільні, каб абмеркаваць становішча. У палітычнай рэзалюцыі паспрабавалі яшчэ раз вылучыць пытанне аб дуалістычнай ці нават тройственнай дзяржаве: беларуска-літоўска-латышскай, як адзіна рэальнай з гаспадарчага пункту гледжання і дастаткова значнай, каб уяўляць рэальную баявую сілу. Рэзалюцыя гэта была паслана нямецкаму канцлеру, але нямецкі ўрад на яе не адрэагаваў. Здарылася новая падзея, якая змяніла агульную палітычную сітуацыю: нямецкія войскі прасунуліся далей на Усход. Я не думаю, што бальшавікі здолеюць устаяць. І нашы надзеі на блізкае развязанне беларускага пытання сталі зноў на рэальную глебу. Брэст-Літоўскай мірнай дамовай германцы прымусілі Расею адмовіцца ад усялякіх прэтэнзій на Заходнюю Беларусь. Праз ліставанне з вамі і праз газету "Гоман" ды іншыя мы ў курсе ўсіх падзей у Менску. Ваш настрой поўнасцю супадае з нашым — Віленская Беларуская Рада з вамі. Яна таксама нацыяналістычна, яна таксама супрацьпастаўлена бальшавіцкай уладзе. Мы, як і вы, ускладаем надзеі на дапамогу Германіі. Нам прыемна ваша запрашэнне да сумеснага абмеркавання палітычнага становішча і неабходнасці сумесных дзеянняў. Мы, вядома ж, удзячны за кааптацыю віленчукоў у Беларускую Раду і прыехалі ў Менск з надзеяй, што нарэшце прыходзіць пара рэалізацыі іншых планаў — нацыяналістычных і выразна контрэвалюцыйных, калі бальшавіцкі пераварот у Піцеры можна лічыць рэвалюцыяй. І да ведама: Віленская Беларуская Рада не настойвае на ідэі стварэння Беларуска-Літоўска-Латвійскай дзяржавы і разарвала ўсякія дачыненні з бальшавіцкай Расеяй, чаго і вам жадаем пасля надання Беларускай Народнай Рэспубліцы статута суверэннай і незалежнай дзяржавы.

Спадар Аркадзь Смоліч пазнаёміў мяне з праектам Трэцяй Устаўной граматы. Гэты дакумент і рашэнне Беларускай Рады па яго сцвярджэнні мусяць стаць гістарычнай з'явай XX стагоддзя. Не смею больш займаць вашай увагі.

Смоліч. Паважаны Антон Іванавіч, мы разлічваем на ваш выступ на Радзе.

Луцкевіч. Як дамовіліся...

Смоліч. Асноўныя тэзы майго дакладу:

Першае. Падзел Беларусі па Берасцейскім трактаце не можа быць цярпімым беларусамі. Другое. Калі савецкі ўрад не можа ануляваць свой подпіс супраць падзелу Бацькаўшчыны, то павінны пратэставаць самі беларусы. Трэцяе. Неабходна для гэтага аб'явіць незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі, гэта значыць толькі тады яна зможа патрабаваць звароту сваіх зямель, калі выступіць у якасьці суверэннай дзяржавы.

Луцкевіч. Стаўлю да ведама прадстаўнікоў Народнага Сакратарыята БНР і кіраўніцтва Беларускай сацыялістычнай грамады, што пакідаю за сабою права агалосіць на пасяджэнні Беларускай Рады чацвёртую тэзу: парываючы дзяржаўную сувязь з бальшавіцкай Расеяй, нічога іншага не выпадае, як абаперціся на Германію, замацаваўшы саюз з ёю ў той ці іншай форме — гледзячы па абставінах...

Сцэна зацямняецца. Заслона апускаецца.

Гісторык *(з прасцэніума да залы).* На пасяджэнні Рады, якое пачалося а 8-й гадзіне вечара 24 сакавіка 1918 года, фракцыя Беларускай сацыялістычнай грамады ўнесла прапанову аб абвяшчэнні незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі. Спавешчанне пра неабходнасць дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі зрабіў кіраўнік фракцыі, фактычны старшыня БСГ, народны сакратар земляробства Аркадзь Смоліч. Абмеркаванне спавешчання доўжылася дзесяць гадзін. І толькі каля шостай раніцы наступнага дня рэзалюцыя аб незалежнасці была прынятая. Прыхільнікі саюзу з Расіяй — прадстаўнікі земстваў, гарадоў і яўрэйскага Бунда — апынуліся ў меншасці. Сябры Аб'яднанай яўрэйскай сацыялістычнай партыі і эсэры ад галасавання ўстрымаліся. Разам з упартай апазіцыяй яны складалі амаль палову Рады. У той самы дзень, 25 сакавіка, пасля перапынку з 7 да 12 гадзін пачалося паартыкульнае абмеркаванне Трэцяй Устаўной граматы да народаў Беларусі. І, нарэшце, каля трэцяй гадзіны дня яна была зацверджана. З 25 сакавіка 1918 года Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчалася незалежнай Дзяржавай, а Брэсцкі мірны дагавор касаваўся. Спрадвечная мара беларускіх барацьбітоў пра сваю незалежную краіну, насуперак волі вялікіх дзяржаў, пачынала здзяйснятца.

І з акцыяй 25 сакавіка ўжо не маглі і не могуць не лічыцца нават ворагі беларускай дзяржаўнасці.

На фоне музыкі Уладзіміра Тэраўскага да гімна БНР на словы Макара Краўцова перад заслонай выходзіць Аркадзь Смоліч і становіцца побач з Гісторыкам.

Смоліч *(узнёсла і ўрачыста чытае перад тэатральнай залай.)*

3-я УСТАЎНАЯ ГРАМАТА
Рады Беларускае Народнае Рэспублікі.

Год назад народы Беларусі разам з народамі Расеі скінулі ярмо Расейскага царызму, які найцяжэй прыціснуў быў Беларусь, ніпытаючыся народу ўкінуў наш край у пажар вайны, якая чыста зруйнавала гарады і вёскі беларускія. Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднага краю апошнее ярмо дзержаўнай залежнасці, якое гвалтам накінулі расейскіе цары на наш вольны і незалежны край. Ад гэтаго часу **Беларуская Народная Рэспубліка абвешчаецца нізалежнаю і вольнаю дзержавай.** Самі народы Беларусі ў асобі свайго Устаноучаго Сойму пастановяць аб будучых дзержаўных зьвязах Беларусі.

На моцы гэтаго трацяць сілу ўсе старыя дзержаўныя зьвязі, якія далі магчмасьці чужому ўраду падпісаць і за Беларусь трактат у Берэсьці, што забівае на сьмерць беларускі народ, дзелючы зямлю яго на часткі. На моцы гэтаго ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі мае ўвайсьці ў адносіны з зацікаўленымі старонамі, прапануючы ім перагледзіць тую часьціну Берэсьцейскаго трактату, якая датычыць Беларусі, і падпісаць міравую ўмову з усімі ваеваўшымі дзержавамі.

Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічбенную перавагу беларускі народ, а менавіта: Магілёўшчыну, беларускія часьці Міншчыны, Гродзеншчыны (з Гроднай, Беластокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежныя часьці суседніх губэрняў, заселеныя беларусамі.

Беларуская Народная Рэспубліка падцьверджывае ўсе тыя правы і вольнасць грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаны Устаўной Граматай ад 9 сакавіка 1918 року.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Народная Воля http://www.nv-online.info
23 САКАВІКА 2007 г.

«Приласкать и уничтожить!»

Гістарычная трагедыя

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Абвешчаючы аб нізалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, Рада яе пакладае свае надзеі на тое, што ўсе любячые волю народы дапомогуць беларускому народу ў поўнай меры зьдзейсьніць яго палітычна-дзяржаўные ідэалы.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі.

Дана ў Менску-Беларускім 24 сакавіка 1918 року.

Музыка ўзмацняецца, гімн "Мы выйдзем шчыльнымі радамі..." магутна гучыць у харавым выкананні. Заслона паднімаецца. За плячыма ў Смоліча і Гісторыка бел-чырвона-белы сцяг з выявай "Пагоні".

Беларускі Нацыянальны Гімн

Мы выйдзем шчыльнымі радамі
На вольны, родны свой прастор
Хай воля вечна будзе з намі,
А гвалту мы дамо адпор.

Няхай жыве магутны сьмелы
Наш беларускі вольны дух;
Ужо сьцяг бел-чырвона-белы
Пакрыў сабой народны рух.

На бой! за шчасьце і за волю
Народу слаўнага свайго!
Браты, цярпелі мы даволі...
На бой! — усе да аднаго!

Імя і сілу беларуса
Няхай пачуе й бачыць той,
Хто сьмее нам нясьці прымусы
І першы выкліча на бой.

Браты, да шчасьця мы падходзім
Хай гром грыміць яшчэ мацней!
Ў крывавых муках мы народзім
Жыцьцё Рэспублікі сваей!

Сцэна зацямняецца.

IX

Гісторык. Пасля абвяшчэння акта аб незалежнасці Беларусі прадстаўнікі земстваў і гарадоў (сябры пераважна рускіх і яўрэйскіх партыяў) выйшлі з Рады БНР — не маглі адмовіцца ад свайго ідэалу адзінай і непадзельнай Расіі. Немцы разагналі Раду БНР і Народны Сакратарыят у дзень абвяшчэння незалежнасці, але нікога не арыштавалі. У пошуку кампрамісу Рада каптавала ў свой склад дзеячаў Беларускага народнага прадстаўніцтва, якое ўзначальваў Раман Скірмунт. Гэта супакоіла немцаў (Скірмунт не раз сустракаўся з генералам Фалькенхайнам), але прывяло да крызісу, свары і расколу ў Народным Сакратарыяце, дзе перавагу атрымалі паплечнікі Скірмунта, які іх узначаліў як старшыня Народнага Сакратарыята. Найперш яны супраціўляліся перадачы зямлі сялянам і настойвалі на далейшым збліжэнні з акупантамі. Сацыялістычная афарбоўка Рады і Народнага Сакратарыята паблякла...

Сцэна асвятляецца.

За сталом на фоне бел-чырвона-белага сцяга з "Пагоняй" уладкаваўся Раман Скірмунт. На крэслах размясціліся Варонка, Лёсік, Серада і яшчэ тры-чатыры незнаёмцы. Уваходзяць Бадунова, Гарун, Смоліч, Грыб і Захарка. Скірмунт выходзіць з-за стала, з кожным здароўкаецца за руку. Смоліч ад вітання ўхіляецца, папраўляючы сваю чупрыну, а рука Скірмунта павісае ў паветры.

Скірмунт *(уладкоўваючыся за стол).* Рад бачыць шаноўнае спадарства ў зборы, бо, на жаль, даўно не бачыліся...

Смоліч *(даволі дзёрзка).* Нас прывяло сюды не столькі запрашэнне пана Скірмунта, колькі абставіны ў краіне, а дакладней у дзяржаве...

Скірмунт. Для выхаванага чалавека заўвага не самая ветлівая, але ж чаго не бывае ў палітыцы...

Гарун. Мы інакш разумеем палітыку і тыя самыя абставіны ў дзяржаве...

Скірмунт *(прымірэнча).* Абставіны сапраўды не простыя. І ёсць патрэба параіцца *(глядзіць на Смоліча)* найперш з Грамадой, выпрацаваць нейкія агульныя крытэрыі паводзін і барацьбы за тую ж дзяржаву і дзяржаўнасць. Скажу не тоячыся: спробы нашы выйсці на ленінскі ўрад праз нямецкае ваеннае камандаванне, каб дамовіцца пра аб'яднанне з тэрыторыяй БНР яе ўсходніх зямель, пакуль не ўдаліся. Выхад на камісара замежных спраў Расеі Чычэрына для перамоваў аб прызнанні БНР таксама не адбыўся. Затое ўдалося стварыць прадстаўніцтва БНР на Украіне, у Літве, дыпламатычныя лісты пайшлі ў Варшаву, Берн, Берлін. У Кіеве адкрылі гандлёвую палату.

Бадунова. Гэта тую, што ўжо паспела аскандаліцца?..

Скірмунт. Не буду ад вас хаваць, што мы сталі шукаць паразумення з камандуючым Х германскай арміі генералам Фалькенхайнам.

Грыб. Навошта ж хаваць тое, што і так ва ўсіх навідавоку?..

Скірмунт *(не зважаючы на рэплікі).* Гаворка перш за ўсё ішла пра арганізацыю тэрытарыяльнага апарату ўлады, правілаў выбараў у вёсках, валасцях, пасёлках, гарадах, губернях дзяржаўных органаў БНР і перадачы ў іх рукі акупацыйнай улады. Мы дамагліся пэўнай самастойнасці ў пытаннях гандлю, прамысловасці, аховы грамадскага парадку. Нямецкае камандаванне таксама імкнецца атрымаць у асобе Рады "пасярэдніка паміж нямецкім кіраўніцтвам і беларускім народам" — гэта словы Фалькенхайна.

Захарка. Нам здаецца, што гэтай мэты акупанты ўжо дасягнулі...

Смоліч. З вашага паслушэнства... А далей што?

Скірмунт *(рэзка ўстае з-за стала).* Немцы ідуць нам насустрач! Дазволілі напісанне і выданне беларускіх падручнікаў. Працуюць курсы настаўнікаў і школьная інспекцыя, пашыраецца сетка пачатковых і сярэдні школ. Адкрыты беларускі педагагічны інстытут! Працуе беларускі тэатр, таварыства драмы і камедыі, шэраг устаноў культуры. На беларускай мове выходзяць шэсць газет і тры часопісы, працуе 11 выдавецтваў. Адно з іх выдала і вашу кнігу вершаў, шаноўны Алесь Гарун.

Гарун. Усё пералічанае, пан Скірмунт, мела месца да вас у гэтым крэсле.

Скірмунт. Але ж я як старшыня ўраду ўсё гэта захоўваю, падтрымліваю, развіваю!

Грыб. А хто б вас, акрамя немцаў, цярпеў так доўга?..

Скірмунт. Гэта нечуваная дзёрзкасць, але вам не ўдасца вывесці мяне з раўнавагі.

Гарун. Ваша дзёрзкасць, з якой вы захапілі ўладу ў створанай намі Незалежнай Рэспубліцы, мяжуе з нахабствам, якое будзе каштаваць народу свабоды.

Скірмунт. Не трэба аб'яўляць сваёй манаполіі на Беларусь і яе свабоду. Я ўсё сваё жыццё служыў і служу Бацькаўшчыне і нікому больш. Сёння адны западозрываюць мяне ў "нямецкай інтрызе", другія — "у польскай". Гэта хвароба такая ж цяжкая, як і шаленства. Яе ўжо апісваў паважаны Язэп Лёсік. Шалёны круціцца, траціць прытомнасць і кусае ўсіх, хто трапіць на дарозе. Нямецкая, як і польская, інтрыгі — гэта атрута, сцвярджаў паважаны аўтар і рэдактар. Атручаны ёю чалавек таксама вар'яцее і робіцца шалёным, але кусае не ўсіх, а толькі здаровых. Хіба гэта не хворыя на розум распускаюць плёткі, што калі людзі ратуюць свой край ад раздзелу і дамагаюцца і ад немцаў, і ад расейцаў, і ад тых жа палякаў прылучэння свае роднае беларускае зямлі, як Віленшчына і Гарадзеншчына, да Беларусі, дык праз гэта яны трымаюцца нейкіх інтрыг?!

Так! Я выхаваны ў польскай, а не маскоўскай культуры. Але ж я паляшук, ліцьвін-беларус, нашчадак беларускай, а не рускай ці польскай, найстаражытнай сям'і. Мае продкі да XVII і пасля XVII стагоддзя, як і я сам, у побыце карысталіся і карыстаемся сваёй, тутэйшай мовай. Я заўсёды быў і застаюся адданы свайму народу — ягонае месцазнаходжанне лічу не за Нёмнам і Бугам і не на Волзе, а тут, на Беларусі, у старажытнай Літванні! Я ўсё жыццё шукаў шэрагі, каб стаць да працы, калі праб'е патрэбная гадзіна. Маім імкненнем заўсёды было і ёсць бараніць свабоду веравызнання, свабоду навучання, свабоду народнага развіцця, свабоду эканамічнага развіцця. У аснове сваёй я кансерватар і ў адрозненне ад сацыялістаў — контррэвалюцыянер, якой бы рэвалюцыі гэта ні тычылася.

Гарун. Навошта ж было контррэвалюцыянеру лезці ў рэвалюцыю?

Скірмунт *(распаляецца).* Вялікі кавалак зямлі паміж Дняпром і Віслай праз вякі мае сваю гісторыю і ўласныя традыцыі, да гэтага дня нязгасныя. Насяленцы гэтай зямлі захоўвалі свае рысы, звычаі, мову і павінны сёння ў пераменныя хвіліны хутчэй, чым калі-небудзь, адчуваць, мысліць і працаваць за сябе саміх, адкідаючы імпартовыя натхненні, з якога б боку яны ні прыходзілі. У гісторыі... у гісторыі мы чэрпаем указанні для будучыні, а не ў Карла Маркса! Хто ўмее глядзець у мінулае, вуха таго не будзе глухім і да голасу сучаснага моманту.

Не віна, а бяда многіх і многіх, што заражаны заразай класавага пачуцця да бліжняга. Гэтая зараза праявілася ў нас з усёй жахлівасцю. Дэвіз адабраць у маёмных і падзяліць сярод бедных ператварыўся ў чуму XX стагоддзя.

Бачыце, пан Скірмунт і да яго падобныя не аддаюць сваёй зямлі сялянам! Ды не забярэм мы яе з сабою! Я ў прынцыпе быў і застаюся супраціўнікам нацыяналізацыі. Я за тое, каб пашырыць сялянскія надзелы найперш за кошт царскіх, царкоўных, манастырскіх земляў, якія павінны падлягаць прымусоваму адчужэнню на карысць малазямельнага. А ў выпадку недахопу зямель прапаную адабраць у землеўладальнікаў тыя землі, якія ім былі падараваны польскімі каралямі, расейскімі царамі ды імператарамі. Адчужаныя землі павінны перадавацца ў распараджэнне нацыянальнага народнага фонду. На правах прыватнай уласнасці зямля павінна належаць селяніну, фермеру, як у Злучаных Штатах Амерыкі ды іншых цывілізаваных краінах. Толькі гэта ўратуе хлебароба ад вечнай кабалы і эксплуатацыі. Фермерская, хутарская, а не кагальная сістэма гаспадарання — адзіная гарантыя правоў і свабод для сялянства. Я ўжо не кажу пра бальшавікоў, якія гатовыя ўсіх загнаць у камуны. Пры дзяржаўнай зямлі сяляне стануць рабамі, рабамі дзяржавы!

Паратунак ад бальшавізму мы будзем шукаць толькі ў Еўропе. А больш няма ў каго. Прызнаюць Беларускую Народную Рэспубліку немцы, прызнае і ўся Еўропа. А як прызнае, то і абароніць. Не дапусціць працягу адвечнай векавой расійскай акупацыі. Разарве гэты пастылы азіяцкі ланцуг! *(Бярэ са стала аркуш.)* Таму і пішам кайзеру Германіі Вільгельму другому. *(Зачытвае зварот.)*

"Рада Беларускай Народнай Рэспублікі як выбрана прэдстаўніца Беларускага Народа да Вашай Імператарскай Вялікасці са словамі глыбачайшай падзякі за асвабаджэньня Беларусі Нямецкімі войскамі з цяжкага ўціску чужаго пануючага здзеку і анархіі.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі дэкларавала нізалежнасць цэльнае і недзялімае Беларусі і просіць Вашую Імператарскую Вялікасць аб абароне ў яе кіраваннях дзеля ўмацавання государственнай незалежнасці і недзялімасці края ў звязі з Германскай Імперыяй.

Толькі пад абаронай Германскай Імперыі бачыць край сваю добрую долю ў будучыні.

Прэзыдэнт Рады: Іван Серада.

Прэзыдэнт Сакратарыяту: Язэп Варонка.

Сябры Рады: Раман фон Скірмунт, Антон Овсянік, Паўлюк Алексюк, Пятро Крэчэўскі, Язэп Ліосік".

Грыб *(устае з крэсла, стрымана, але рашуча).* Як удзельнік Вялікай Расейскай рэвалюцыі, я, народны сакратар земляробства, пратэстую супраць такой тэлеграмы германскаму манарху ад імя ўсяго беларускага народу і лічу здрадай рэвалюцыйнаму сацыялізму ўваходзіць у хаўрус з манархам і аддаваць у апеку імперыялістычнай буржуазіі Германіі наш шматмільённы працоўны сялянскі люд. Я, як сацыяліст і рэвалюцыянер, выходжу з Народнага Сакратарыята. Гонар маю, панове здраднікі! *(Выходзіць.)*

З крэслаў устаюць Гарун, Смоліч, Бадунова і Захарка.

Гарун. Такой здрады і граху перад народам падпісанты гэтага ганебнага паслання ніколі не замоляць ні кожны паасобку, ні ўсе разам.

Бадунова. Прыніжана не толькі годнасць Беларускай Народнай Рэспублікі, але зняважана і нацыя беларусаў.

Смоліч. Мы ўсе выходзім з ураду здраднікаў, але не зыходзім з барацьбы.

Захарка. Ганьба... найперш нашым былым сябрам.

Усе пратэстанты выходзяць.

Сцэна зацямняецца.

Гісторык. Крызіс ва ўрадзе прывёў да расколу найбольш уплывовай партыі ў Радзе БНР — Беларускай сацыялістычнай грамады. На месцы БСГ узніклі новыя партыі: Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў. Усе яны характарызаваліся левацэнтрызмам. На правых пазіцыях стаялі група Скірмунта—Алексюка і Беларуская хрысціянская злучнасць. Сярод беларускіх клерыкалаў вылучаліся ксяндзы Віцэнт Гадлеўскі, Адам Станкевіч, Аляксандр Астрамовіч (вядомы як паэт Андрэй Зязюля), Фабіян Абрантовіч, Кастусь Ставовіч (ён жа паэт Казімір Сваяк). У палітычнай барацьбе левых з правымі паэтычна-клерыкальны пачатак беларускай дзяржаўнасці якога-небудзь сур'ёзнага пачатку не меў. А далейшыя ўнутраныя сваркі "адраджэнцаў" і ліпеньскі 1918 года ўрадавы крызіс змёў Рамана Скірмунта, як і яго папярэднікаў, а старшынёй Рады народных міністраў і міністрам замежных спраў БНР з кастрычніка стаў сацыял-дэмакрат, вопытны палітык, вядомы грамадскі дзеяч, гісторык, публіцыст, літаратурны крытык і выдавец Антон Луцкевіч. Ён і ўвойдзе ў гісторыю як апостал Нацыянальнага Адраджэння беларускай дзяржаўнасці і апошняя ахвяра бальшавізму з кагорты адраджэнцаў. Ахвярай перадапошняй стане Скірмунт. *(Ідзе да свайго рабочага стала, садзіцца ў крэсла, закрывае твар рукамі.)*

X

Перад сталом узнікае здань Скірмунта.

Скірмунт. Вы хацелі мяне бачыць? У вас ёсць пытанні да перадапошняга старшыні ўрада БНР?.. Не можаце вызначыцца ў адносінах да пана Скірмунта?

Гісторык. Так, Раман Аляксандравіч.

Скірмунт. А што вас, уласна, засмучае ў маёй асобе?

Гісторык. Вашы сучаснікі так званай дэмакратычнай адраджэнцкай плыні...

Скірмунт. Дакладней — сацыялістычнай плыні...

Гісторык. Абвінавацілі вас у здрадзе; бальшавікі залічылі ў "ворагі народа"; нямецкія акупанты ставілі на вас, як вы ставілі на іх; сучасныя мне літаратары знаходзяць у вашай дзейнасці рысы самааддасці Айчыне...

Скірмунт. А вас што ўва мне цікавіць?

Гісторык. Чалавечая сутнасць знакавай фігуры другой паловы XIX стагоддзя і першай — XX-га.

Скірмунт. Можаце з поўным правам аднесці Скірмунта да фігураў трагічных абодвух стагоддзяў. Але няхай вас гэта не вельмі займае, бо гісторыя, на жаль, не мае ўмоўнага ладу. А Беларусь, вам сучасная, зноў на лёсавызначальным раздарожжы, як і тады, на пачатку XX стагоддзя. Гэе новым фігурантам, як трагічным, так і фарсавым, давядзецца выбіраць: ці зноў лезці ў імперскае расейскае ярмо, ці прычыніцца да аб'яднанай цывілізаванай Еўропы, лёс якой сёння вырашае не адна Германія. Перад вамі, постсавецкімі, паўстала жорсткая дылема: ці нешта выбраць новае, ці зноў застацца на стагоддзі ва ўмовах унутранай акупацыі. Дык ці варта траціць час на высвятленне нашых памылак, подзвігаў і ахвяр? А калі казаць пра сябе, то перад вамі душа сумленнага беларуса. Настолькі сумленнага, што энкавэдысты ад вызваліцеляў Заходняй Беларусі нават не заводзілі на пана Скірмунта следчай справы, а даручылі прапойцам з тутэйшых застрэліць неадкладна. І тыя застрэлілі. Перад гэтым мне і ўспомнілася дырэктыва Сталіна. Нас, беларускіх адраджэнцаў-бэнээфаўцаў, "приласкать и уничтожить". Каго прылашчылі, а каго і не. А разам вынішчылі амаль 900 асобаў, і якіх?! Застаўся, калі застаўся, апошні з сапраўдных беларусаў — Антон Луцкевіч. Каб адраджэнцаў Беларусі XXI стагоддзя не пачалі адстрэльваць зноў, не памыляйцеся самі і не дапускайце здрады.

Стол Гісторыка раптоўна зацямняецца і адразу ж асвятляецца. Прывід Скірмунта знікае.

XI

Гісторык. Апошняй ахвярай адраджэнцаў стане апошні прэм'ер-міністр Беларускай Народнай Рэспублікі Антон Луцкевіч. Перад арыштам у верасні 1939 года ён яшчэ паспее выступіць перад беларускай інтэлігенцыяй Вільні. І апошнімі яго словамі будуць спадзевы на тое, што "стварэнне адзінай свабоднай Савецкай Беларусі адкрые для беларускай культуры шлях шпаркага развіцця ўперад. Не будзе больш працоўны беларус застрашвацца турмой і бесчалавечнымі здзекамі".

Асвятляецца цесная турэмная камера. У маленькае закратаванае акно глядзіць вязень у паласатай вопратцы. У ім цяжка пазнаць Луцкевіча. Грымяць запоры дзвярэй. У камеру ўваходзіць турэмшчык, які нагадвае маладога чырвонага камандзіра Рамнёва. Не паварочваючыся, Луцкевіч па турэмных правілах выцягвае рукі на сцяну, шырока расстаўляе ногі. Рамнёў абшуквае яго з галавы да ног і выходзіць. Уваходзіць следчы П а н о ў у форме малодшага лейтэнанта НКУС.

П а н о ў. Продолжим...

СОБЫТИЯ В МИРЕ

Президент Ирана Махмуд Ахмадинежад Совету Безопасности ООН: «Ваша резолюция — рваный клочок бумаги»

В декабре прошлого года Совбез ООН единогласно проголосовал за ввод ограниченных санкций в отношении Тегерана, отказывающегося приостановить работы с ураном. ООН запретила поставки в Иран материалов и технологий, которые могут применяться в реализации иранской ракетной и ядерной программ, а также заморозила активы 10 ведущих иранских компаний и 12 частных лиц, имеющих отношение к этим программам.

Теперь — ужесточение санкций. Президент Ирана с этим не согласен.

Канцлер Германии Ангела Меркель: «Европейский Союз — это не христианский клуб»

Визит канцлера Германии Ангелы Меркель в Польшу начался не совсем обычно — переговоры с польским премьером Ярославом Качиньским состоялись практически сразу же после выхода из самолета, прямо в аэропорту. Такая поспешность объяснялась тем, что через полчаса Качиньский в свою очередь улетал с визитом в Данию.

Выступая с лекцией в Варшавском университете, Ангела Меркель сделала важное заявление о том, что ее правительство не поддерживало и не будет поддерживать немецкие организации, которые добиваются от Польши компенсаций за насильственное выселение немцев с нынешних западнопольских земель после окончания Второй мировой войны.

"Одно можно сказать точно: пересмотра истории Германией не будет... Только вместе мы можем добиться успеха. Нельзя больше допускать кровопролития, войн и преследований... Я осознаю, что поляки в прошлом пережили огромные страдания из-за немцев. Во время Второй мировой войны погибло более 6 миллионов польских граждан", — сказала руководитель немецкого правительства.

Однако с принятием европейской конституции скорее всего будут сложности. Варшава настаивает на том, чтобы в преамбуле этого документа содержалась запись о "христианских корнях" Европы, в то время как Ангела Меркель открыто заявила, что Европейский Союз — это "не христианский клуб, а если уж называть Европу клубом, то это клуб общих ценностей, частью которых является также и христианство".

Важным для Польши было и заявление Ангелы Меркель о том, что по вопросу о российском эмбарго на польские продукты Совет ЕС "выработал позицию, идентичную польской". "Европейский Союз и председательствующая в нем сейчас Германия разговаривают с Россией не только об энергетической безопасности, но и о правах человека", — подчеркнула канцлер.

Европейский полдень

В выходные лидеры стран Евросоюза соберутся в Берлине, чтобы отпраздновать 50-летие со дня основания блока подписанием декларации, направленной на определение сущности ЕС.

Эта декларация накануне оказалась в центре внимания, потому что в последнее время создалось впечатление, что ЕС утратил ориентацию. Критический момент слома наступил в 2005 году, когда Франция и Нидерланды провели референдумы по проекту конституции. Население обеих стран отвергло эту идею, что знаменовало собой окончание периода амбиций для ЕС, когда была принята общая валюта и блок расширился, приняв в свой состав 10 новых стран.

Тем не менее сегодня Европа — сверхдержава мирового масштаба и исторического значения, непревзойденная по экономической мощи. Она создала одну из самых успешных систем управления — государство социального обеспечения. При всех своих недостатках эта система позволила европейцам достичь беспрецедентного уровня достатка и безопасности. Это самый успешный пример международного сотрудничества в новейшей истории.

Первоначальное Европейское экономическое сообщество, которое в 1957 году состояло из шести стран, разрослось до 27 участников, объединив почти 500 млн человек от Аранских островов в Ирландии на западе, через всю Центральную Европу и до Черного моря на востоке. Европейские ценности распространяются по всему миру.

Итальянская La Repubblica публикует интервью с канцлером Германии Ангелой Меркель. *"Мы должны громче заявить о том, что Европа является ответом на вызовы глобализации. Перед лицом таких конкурентов, как Китай, Индия, Латинская Америка, европейцы могут эффективнее действовать вместе"*, — сказала она.

Канцлер Германии попыталась ответить на вопрос, каким будет ЕС через 50 лет, когда ему исполнится 100 лет. *"Я надеюсь, что в ближайшие 50 лет ЕС сумеет внести вклад в позитивное развитие исламских стран и способствовать тому, чтобы избежать жестокого столкновения между религиями: более того, все должны понять, что у нас есть общие ценности, которые мы можем защищать вместе. Я надеюсь, что в течение ближайших 50 лет нам удастся нанести поражение терроризму. Нам потребуется много работать"*, — сказала Ангела Меркель.

Консерваторы обогнали...

На парламентских выборах в Финляндии произошла сенсация. Консерваторы из оппозиционной Коалиционной партии Юрки Катаинена обогнали социал-демократов и получили в новом парламенте всего на одно место меньше правящей партии Центра премьер-министра Матти Ванханена. К тому же консерваторы оказались единственной из основных партий, увеличившей свое присутствие в парламенте. Правящая коалиция, чье правительство считалось самым популярным в истории Финляндии, наоборот теряет 12 депутатских мандатов.

В результате состоявшихся выборов из 200 мест в парламенте партия Центра получает 51. Оппозиционная Коалиционная партия выходит на второе место с 50 депутатскими мандатами. Социал-демократы получают лишь 45 мест.

Так солдаты Королевского ирландского полка встречали праздник в День Святого Патрика. Считается, что он научил ирландцев варить пиво.

07/07/07, *или Страсти вокруг чудес света*

Более 2 тыс. лет спустя, после того как древние греки назвали семь чудес света, миллионы людей со всего мира подают голоса, чтобы обновить список.

Движимые национализмом, желанием сохранить памятники, любопытством или просто скукой, более 4 млн китайцев, мексиканцев, бразильцев, американцев и жителей других стран подали свои голоса. В финал попало 21 чудо, включая Великую китайскую стену, Тадж-Махал, афинский Акрополь, древний иорданский город Петру и египетские пирамиды Гизы. Об этом сообщает "Вашингтон пост".

На звание чудес претендуют также британский Стоунхендж и статуи с острова Пасхи в Чили, Эйфелева башня, статуя Свободы и здание оперы в Сиднее.

Семь победителей будут названы 7 июля, то есть 07/07/07.

Новый список присоединится к списку семи древних чудес, из которых до наших дней сохранилось только одно, пирамиды.

В последнее время немало экспертных комиссий составляли списки семи чудес современного мира. Например, Американское общество гражданских инженеров составило список, в который входят небоскреб Empire State Building и тоннель под Ла-Маншем. В списке книги Reader's Digest "Интересные факты" встречаются космический челнок и Шартрский собор во Франции.

Идею предложил канадец швейцарского происхождения, кинорежиссер Бернард Вебер, который, как говорится на сайте организации, в 2001 году создал в Цюрихе некоммерческий фонд "для защиты наследия человечества во всем мире", чтобы напомнить людям "об уничтожении природы и разрушении этого рукотворного наследия".

Вебер, имеющий явный талант к саморекламе, в последние месяцы устроил объезд финалистов, снимая объекты на кино- и фотопленку для будущего фильма и книги о проекте. Организаторы обещают, что половина заработанных денег пойдет на охрану и реставрацию объектов, находящихся под угрозой.

Голосование началось в 2001 году. Количество претендентов выросло до 177, из них было отобрано 77, а затем, в конце 2005 года, группа экспертов оставила в списке 21 финалиста, по одному на страну. Среди экспертов был Федерико Мэйор, который 12 лет возглавлял ЮНЕСКО, структуру ООН по культурному наследию.

Победа чудес будет основана исключительно на поданных голосах.

По словам Виринг, по состоянию на 31 января в семерку входили храмы Петры, пирамиды, Великая китайская стена, Тадж-Махал, статуи острова Пасхи, римский Колизей и город инков Мачу-Пикчу в Перу. Значительную часть кампании статуя Свободы упрямо оставалась в первой семерке, сказала она.

Организаторы отмечают большой энтузиазм, который голосование вызвало в развивающихся странах, где Интернет пребывает в зачаточном состоянии и люди иногда подавали голоса письмами по цепочке и другими подобными способами.

ТЭМА ДНЯ

Усё той жа тарарам…

У многіх краінах свае яркія прыкметы вясны.

У Японіі, напрыклад, — гэта квіценне вішні, ці сакуры па-іхняму. Тады японцы выбіраюцца ў паркі ці выязджаюць у наваколле, радуюцца дзівосным відовішчам ды разважаюць аб сэнсе жыцця.

У нашых суседзяў, палякаў і літоўцаў, вясна прыходзіць з журчаннем ручайкоў, паўнаводдзем рэк і песняй жаўрука.

А ў сённяшняй Беларусі аб ёй нагадваюць дыскусіі чыноўнікаў на тэму "Дзе ўзяць сродкі, каб набыць паліва для вясенніх палявых работ?". Як толькі земляробы заяўляюць: "Дайце грошы, а то не выйдзем у поле!" — значыць, напярэдадзе цёплыя дзянькі і клёкат буслоў.

Не выключэннем стаў і сёлетні год. Не першы тыдзень у кабінетах чыноўнікаў і на старонках афіцыйнай прэсы вядуцца размовы, хто і колькі сродкаў выдзеліць для вёскі — колькі з рэспубліканскай казны, колькі з мясцовай, колькі авансу дадуць нарыхтоўчыя і перапрацоўчыя арганізацыі за будучую пастаўку прадукцыі, на якіх умовах выдзеліць крэдыт.

Днямі ў гэты вясенні тарарам (шум, гоман — так тлумачыць гэтае слова слоўнік) уліліся галасы двух адказных работнікаў Мінсельгасхарча — намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення механізацыі і тэхнічнага прагрэсу **Уладзіміра КУЛЬКІ** і начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства **Рыгора РАМАНЮКА**.

Першы паведаміў, што гаспадаркам краіны будуць выдзелены сродкі на закупку паліва для вясенніх палявых работ.

А што зробіш? Інакш не пасеюць. На пасяўную трэба 187 тысяч тон дызельнага паліва, 37,9 тысячы тон аўтамабільнага бензіну ды 8,6 тысячы тон маторных маслаў на агульную суму 386,5 мільярда рублёў. А на канец мінулага тыдня ў гаспадарках было назапашана толькі 7,6 тысячы тон дызельнага паліва ды 2,6 тысячы тон аўтамабільнага бензіну. Кропля ў моры!

Хаця на складах канцэрна "Белнафтахім" для патрэб АПК ёсць больш за 40 тысяч тон дызельнага паліва і больш за 10 тысяч тон бензіну. Як сказаў спадар Кулька, паліва ў краіне ёсць, трэба толькі выкупіць.

Ды ў нашых гаспадарках хранічная хвароба — няма грошай. Вось і вымушаны рабіць у АПК чарговыя фінансавыя ўліванні.

Праўда, кажуць, што халявы сёлета не будзе. Гэтыя грошы гаспадаркі павінны вярнуць дзяржаве пасля ўборкі ўраджаю, падкрэсліў выступоўца. Напомнім, што летась сельскай гаспадарцы было выдзелена *"безвозмездно"* 60 тысяч тон паліва. Кажуць, што сёлета такога падарунка не будзе.

Сёлета праблема не толькі з палівам, але і з нарыхтоўкай угнаенняў. Па даных на сярэдзіну месяца, а дакладней, на 16 сакавіка, толькі крыху больш за палову (54,3%) мінеральных угнаенняў было ў наяўнасці пад яравую сяўбу. Летась на гэты час іх было аж 73,4%. Правапнавана кіслотных глеб усяго 20% ад плана. Каб паскорыць справы (а адкладваць нельга), патрэбны сродкі і на гэта.

І яны будуць выдзелены. Усяго на правядзенне вясенніх палявых работ сёлета накіруюць, як паведамляе БЕЛТА са спасылкай на словы начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства Мінсельгасхарча Рыгора Раманюка, больш за трыльён рублёў. Пры гэтым ён дадаў, што нарыхтоўчыя і перапрацоўчыя прадпрыемствы праавансуюць сельскагаспадарчыя арганізацыі за прадукцыю раслінаводства ўраджаю 2007 года.

Канешне, сельскай гаспадарцы трэба дапамагаць. Але калі такая вялікая і важная галіна народнай гаспадаркі не можа сама сябе пракарміць і патрабуе штогод столькіх *"аварыйных"* фінансавых уліванняў, дык значыць, нешта не так ці то ў самой галіне, ці то ў краіне ў цэлым. А хутчэй і там, і там — той жа тарарам.

Яўген ТАЎГЕНЬ.

В Китае начала работу торговая организация «Белнефтехим—Шанхай»

Как сообщил БелаПАН представитель "Белнефтехима", учредителями торговой организации выступают белорусский концерн и китайское предприятие "Hengsen Shanhai". Через нее в Китай будут поставляться шины и химические волокна. Также планируется закупать в Китае по приемлемым ценам сырье для белорусских химических заводов.

Как сообщил специалист, в 2007 году "Белнефтехим" намерен создать филиал торговой компании в Пекине. Планируемый товарооборот концерна через торговое предприятие в этом году может составить порядка 50 млн долларов. Также намечено создание совместной торговой организации в Гонконге. Основу экспорта через нее составят акриловое волокно и жгут, полиамид и полиамидные нити.

В настоящее время представительства и торговые организации концерна "Белнефтехим" действуют в России, Украине, Латвии, Германии и США.

РЕЗОНАНС

«Неужели Чернобыля мало?» Под таким заголовком в нашей газете 2 февраля этого года была опубликована статья. Она вызвала большой резонанс…

Дорогая редакция "Народной воли"!

В последнее время белорусские СМИ начали вести пропаганду о необходимости строительства АЭС, мотивируя это желанием обезопасить страну от энергозависимости. Я, переживший мучительные испытания после чернобыльской катастрофы, которая погубила моего сына, безвременно лишила жизни десятки моих земляков, односельчан, друзей, не могу равнодушно относиться к этой пропаганде. Ведь безаварийных и безвредных АЭС человечество еще не изобрело и сам Бог предупредил человечество чернобыльской катастрофой. Наша Беларусь до сих пор не избавилась от последствий той катастрофы.

Свой протест я высказал в письме в Министерство энергетики Беларуси и ученым-атомщикам Национальной академии наук Беларуси. Из министерства получил ничего не обещавшую отписку, а из Академии наук вообще никакого ответа не получил. Прошу редакцию "Народной воли" опубликовать мое письмо ученым-атомщикам.

С уважением —

Аким СТАРОХАТНЫЙ,
пенсионер.

Задумайтесь над эхом той катастрофы…

Уважаемые ученые-атомщики Академии наук!

Возможно, члены правительства и президент не вполне осведомлены в вопросах атомной энергетики и под воздействием нарастающих цен на энергоресурсы ищут способы, как обезопасить Беларусь от энергозависимости. Но вы же знаете, как опасен так называемый мирный атом.

Мотивировка в том, что в мире работают 442 ядерных энергоблока и никакой опасности для населения стран не приносят, не может быть оправдана в вопросе крайней необходимости строительства АЭС в нашей Беларуси. Взгляните на карту радиационной обстановки: многие места загрязнены цезием-137, стронцием-90 и плутонием-238, 239, 240. Пятна загрязнения разбросаны почти на половине территории Гомельской и Могилевской областей, есть пятна загрязнений и в Брестской, Гродненской областях.

Только мужество, самопожертвование пожарников, вертолетчиков и тысячи ликвидаторов спасли ближайшие Украину, Беларусь от взрыва большей мощности. Но и взрыв 4-го реактора ЧАЭС разбросал на огромные территории радионуклиды, обвестил весь мир и человечество о том, какая опасность угрожает ему от использования ядерной энергии.

Не случайно такие высокоразвитые европейские страны, как Германия, Швеция и другие через 20 лет после чернобыльской катастрофы отказываются от строительства АЭС, а имеющие закрывают.

К слову, наше белорусское руководство заявляло, что будут строить страну так, чтобы она была похожа на Германию и Швецию. Следовало бы взять пример с этих стран и не планировать строительства АЭС.

И с экономической точки зрения строить АЭС в нашей стране не выгодно. Те огромные средства, которые потребуются на строительство АЭС, городского поселка энергетиков при ней, закупке ядерного топлива, захоронения ядерных отходов АЭС и последующее закрытие АЭС (ведь ядерные реакторы рассчитаны на эксплуатацию не более 30 лет) лягут тяжелым бременем на наш бюджет, то есть на плечи простого народа и нисколько не улучшат жизнь простого труженика. Лучше бы эти средства расходовать на покупку готовой электроэнергии у соседних Украины и России, ведь у них уже давно создана технология выработки электроэнергии не только АЭС, но и гидростанциями. А больших затрат на строительство высоковольтных линий нам не потребуется, ведь в советские времена они пронизывали все республики СССР, было создано так называемое энергокольцо. Близость границ с Россией и Украиной уменьшит потери переброски электроэнергии по высоковольтным линиям.

А еще лучше бы вам ученым, начать разработки по получению электроэнергии от природных ресурсов: солнца, воды, ветра, биомассы. Сельскую местность вполне можно обеспечить электроэнергией, используя энергию солнца, ветра и воды наших многочисленных рек. Нашу высокоемкую промышленность, на мой взгляд, необходимо переводить на высокоэкономическое производство. Вот о чем необходимо думать правительству, а не использовать бюджетные средства на строительство АЭС.

Наш многострадальный народ, уверен, перенесет в крайнем случае нехватку электроэнергии. А вот второго Чернобыля вряд ли. Успокаивать людей безопасной работой АЭС в Беларуси, на мой взгляд, аморально. Мол, нас окружают десятки АЭС России и Украины. Но эти страны имеют большие территории и людские ресурсы и в случае неполадок на АЭС найдут силы и средства обезопасить себя от последствий катастроф.

Вспомните, какие огромные средства были затрачены на ликвидацию последствий чернобыльской катастрофы бывшим Советским Союзом. Нашей десятимиллионной стране справиться своими силами с катастрофой, подобной Чернобылю, от которой мы не гарантированы, невозможно.

Мне до сих пор снятся страшные сны о днях эвакуации наших сел и деревень Брагинского района. Вспоминаю и годы войны, когда они горели в страшных пожарищах. Мы переживали те дни, месяцы в лесах, болотах, оставшиеся в живых возвращались в свои обугленные селища, возрождали к жизни родные села и деревеньки.

Большие села Колыбань, Чиколовичи, Посудово, Крюки, Пирки моей малой Родины возвращались из пепла. А они не раз горели в пожарищах воин, но оживали, возрождались. Только Чернобыль навеки стер их с лица земли. Многие их жители за 20 послечернобыльских лет ушли в мир иной и некому уже будет их возрождать. Только их названия пока остались на картах Беларуси с пометкой (нежилой). Скоро и эти пометки исчезнут на новых картах. Задумайтесь и вы, ученые-атомщики, над этим эхом чернобыльской катастрофы.

С уважением —

Аким СТАРОХАТНЫЙ,
чернобылец,
изгнанный со своей
малой Родины
чернобыльской катастрофой.

Плодородие почв деградирует?

Чтобы повысить содержание гумуса в почве в среднем на 0,5 процента, колхозам и совхозам страны потребовалось тридцать лет. На решение этой задачи были выделены огромнейшие капиталы.

Но вот тревожный сигнал — за последние годы содержание органических веществ в почвах снизилось на 0,03 процентных пункта. Особенно очевидна деградация плодородия земель на Полесье. А вообще запасы гумуса в пахотных землях уменьшаются в каждом втором районе, что становится угрозой последующего снижения продуктивности полей.

Степан КРАВЦОВ.

Снизились темпы жилищного строительства

В Беларуси в феврале 2007 года ввод в эксплуатацию жилья за счет всех источников финансирования составил 240 тыс.кв.м, что на 30,5% меньше, чем в январе 2007 года. В январе снижение темпов жилищного строительства по сравнению с декабрем 2006 года составило 43% — передает АФН.

Склады завалены продукцией

По данным на 1 марта 2007 года, запасы готовой продукции на промышленных предприятиях Беларуси увеличились в фактических ценах с начала года на 28,8% при росте индекса цен производителей промышленной продукции за этот период на 13,5%. Об этом БелаПАН сообщили в Министерстве статистики и анализа. Соотношение запасов готовой продукции и среднемесячного объема производства в январе-феврале 2007 года составило 61,6% (в прошлом году — 58,2%). В фактических ценах это 3 трлн 267,5 млрд рублей.

Вы уже купили бриллиант?

С середины декабря 2005 года по 2 марта 2007 года Национальный банк Беларуси продал населению 1015 бриллиантов общей массой 192,22 карата на 362 тысячи долларов США в эквиваленте. Об этом сообщил БелаПАН пресс-секретарь Нацбанка Михаил Журавович.

Реализацию аттестованных бриллиантов главный банк страны начал 14 декабря 2005 года. Покупателям предлагаются камни различных качественно-цветовых характеристик от 0,05 до 0,8 карата классической круглой огранки с 57 гранями, которые изготовлены по российским стандартам.

В Нацбанке отмечают, что спросом пользуются все без исключения бриллианты. К их реализации, которую сначала проводило только главное управление Нацбанка по Минску и Минской области, присоединились главные управления Нацбанка в остальных областях.

ПОУЧИМСЯ У СОСЕДЕЙ

Поворот к ветряку

Что делать, когда быстро растут цены на энергоносители? Повернуться лицом к новым источникам.

Так решили наши соседи по Европейскому Союзу. И взяли курс на быстрое увеличение доли возобновляемых источников при производстве энергии и повышение эффективности ее использования. Это будет определять энергетическую и экологическую политику в Европе в ближайшие десятилетия.

Об этом заявил министр экологии Германии Зигмар Габриэль на трехдневной Европейской конференции по альтернативной энергетике в Брюсселе, в работе которой принимали участие около 800 политиков, ученых и представителей энергетических компаний.

В пользу развития альтернативной энергетики говорят, по мнению министра, не только экологические аргументы, но и увеличение цен на нефть и газ, рост потребления энергии во всем мире, а также растущая нестабильность в отдельных регионах, из которых поставляются обычные энергоносители.

Европейский Союз в качестве обязательной цели принял решение об увеличении доли возобновляемых источников в энергетике стран ЕС до 20 процентов к 2020 году. Именно такое предложение содержится в новом "энергопакете", представленном Европейской комиссией 10 января. Главы государств и правительств Евросоюза будут обсуждать этот вопрос на саммите 8 и 9 марта текущего года.

Радио "Немецкая волна", рассказав об этом, продолжает, что экологические организации считают "20-процентную цель" несколько размытой. По мнению представителя немецкого Союза защиты окружающей среды BUND, вполне реалистичным может быть увеличение доли возобновляемых источников до 35 процентов области электроэнергетики, до 25 процентов при производстве тепла и до 20 процентов — биодизеля.

В Германии альтернативная энергетика в прошлом году произвела 73,2 миллиарда киловатт/часов электроэнергии, на 15 процентов больше, чем в 2005 году. Доля возобновляемых источников энергии в немецкой электроэнергетике выросла с 10 до 11,9 процента. Благодаря государственной поддержке альтернативной энергетики Германия уже сейчас практически выполнила поставленную ЕС цель, согласно которой к 2012 году таким образом должно производиться 12,5 процента электричества, заявил глава объединения немецких производителей электроэнергии Эберхард Меллер.

В 2006 году с использованием энергии ветра было произведено 30,5 (27,2 в 2005 году) миллиарда киловатт/часов электричества, на ГЭС — 21,6 (20,8) миллиарда, из биомассы — 15,5 (11,2) миллиарда кВт/ч. Мусоросжигательные предприятия произвели 3,6 (3) миллиарда, а из солнечной энергии получено 2 (1,3) миллиарда кВт/ч электричества.

Евгений ТАВГЕНЬ.

SOS!

Фермера — у Чырвоную кнігу?

Летась на Віцебшчыне было зарэгістравана 19 фермерскіх гаспадарак, а скасавана 44. Вяскоўцы спыняюць сваю дзейнасць, бо яна страчвае сэнс: страты перавышаюць даходы. На думку саміх фермераў, каб мець поспех, патрэбны значны пачатковы капітал на набыццё тэхнікі, жывёлы, на будаўніцтва гаспадарчых памяшканняў.

Дзяржава з гэтым не дапамагае, крэдыт у банку — або недаступны, або патрабуе вялікага закладу, а спецыяльнага пазямельнага банка, які быў у Віцебску да 1917 года, даўно няма. А закласці пад крэдыт кватэру ў горадзе або прыгарадны дом — небяспечна, бо фермерская праца рызыкоўная, і можна за адзін год пры неўраджайнасці ператварыцца ў нішчымніка і бяздомнага.

Штогод каля паўсотні фермераў Віцебшчыны кідаюць займацца вытворчасцю сельгаспрадукцыі, бо гэта нерэнтабельна. Працягваюць працу на зямлі толькі тыя, хто ў свой час, каля 20 год таму, набыў тэхніку, паспеў узвесці фермы, склады і катэджы для сваіх сем'яў, стварыў пэўны капітал, працэнты ад якога даюць упэўненасць у заўтрашнім дні. Такіх у 21 раёне вобласці засталося 378, хоць чатыры гады таму было амаль удвая больш.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ОТКРОВЕННО О НАС

Беларуси рано или поздно придется пойти на продажу российским компаниям своих нефтеперерабатывающих заводов

Президент Беларуси Александр Лукашенко любит рассуждать о необходимости создания союзного государства с Россией. Хотя на практике почти ничего для этого не делает. С нынешнего года все встало на свои места. Беларусь будет покупать газ по самой низкой цене из всех стран ближнего зарубежья (100 долларов за 1000 куб. м), но за это в течение четырех лет она передаст "Газпрому" 50% акций компании "Белтрансгаз". Если учесть, что белорусский участок газопровода Ямал-Европа уже на 100% принадлежит "Газпрому", получается, что российско-белорусские отношения в газовой сфере будут партнерскими вне зависимости от личности белорусского руководителя.

В нефтяной сфере Беларуси также рано или поздно придется пойти на приватизацию (продажу российским компаниям) своих нефтеперерабатывающих заводов. Ранее нефть, поступавшая на белорусские НПЗ, не облагалась экспортной пошлиной, поэтому белорусские власти получали огромную выгоду от экспорта полученных из нее нефтепродуктов. С нынешнего года пошлина введена (хотя и не такая большая, как в отношении других, несоюзных государств) — и доходы, распределяемые Александром Лукашенко, сократятся. Очевидно, что рано или поздно ему придется пойти на уступки и согласиться на приватизацию НПЗ — другого варианта просто нет.

Нынешние российские власти дают четкий сигнал белорусскому лидеру, что видят союзное государство прежде всего в сфере экономической интеграции, а не политических заявлений о дружбе и добрососедстве. США и другие страны Запада терпят режим Александра Лукашенко только потому, что его поддерживает Россия. В противном случае его давно бы лишили власти. Либо мирным путем, через очередную цветную революцию, либо военным (военный переворот или прямая агрессия). Напомним, что как только Россия дала понять, что не будет воевать за Слободана Милошевича, на Сербию обрушился град бомб с самолетов НАТО.

Фрагмент из статьи Сергея Правосудова, директора Института национальной энергетики.

"Независимая газета".

Народная Воля http://www.nv-online.info
23 САКАВІКА 2007 г.

ЛЁСЫ ЛЮДСКІЯ

Славік

У маёй роднай вёсцы Чаплін, что ў Лоеўскім раёне Гомельскай вобласці, жыў цудоўны чалавек Вячаслаў Дзмітравіч Дзенісенка, або проста Славік, як сардэчна называлі яго ў акрузе і старыя, і маладыя. З сялянскага роду паходзіў. Яго бацькі, дзяды і прадзеды з незапамятных дзён на тутэйшай зямельцы працавалі. Тут і пахаваны. На высокім, маляўнічым пагорку правага берага Дняпра, адкуль адкрываецца дзівосны краявід.

Вячаслаў Дзмітравіч мужыком быў самавітым. Шырокі ў плячах, русавалосы, мажны. Вясёлы і гаваркі. На загарэлым твары іскрылася ветлівая ўсмешка. Рукі дужыя, учэпістыя, мазолістыя.

Мноства цікавых гісторый ведаў. Павучальных і смешных. Артыстычна, з гумарам мог расказаць. А як спяваў! Можа, таму і прыцягваў да сябе людзей, нібы тым магнітам.

Цяжкім, нават трагічным выдаўся яго лёс. У 11 гадкоў напаткала вайна. Бацька і старэйшы брат на фронт паспяшаліся. Назад ужо не вярнуліся...

Фашысты тым часам наступалі. Летнім ранкам жыхароў Чапліна ўстрывожыў страшэнны грукат. Змінаючы ўсё на сваім шляху, па вуліцы мчалі танкі з чорнымі крыжамі, тахкалі матацыклы з узброенымі салдатамі. Следам з аўтаматамі напагатове топала каванымі ботамі пяхота.

Народ заціх у трывожным чаканні. Вечарам таго ж дня чужынцы прадэманстравалі свой звярыны нораў. З крыкамі і лаянкай нахабна ўрываліся ў хаты. Білі, зневажалі, брыдкасловілі, каштоўныя рэчы выносілі. Хто спрабаваў супраціўляцца — прыкладамі лупцавалі.

Славіка разам з маці і сястрычкай на вуліцу гвалтоўна выкінулі. У доме афіцэр пасяліўся. Давялося ў хляве мясціцца.

Жылі па-жабрацку: ні хлеба, ні мяса, ні яек. Спалі на саломе. Хадзілі басанож. Елі, што, як кажуць, Бог пашле. А тут яшчэ маці занядужала. І лячыць, і карміць неабходна было. А чым?

Хлопец збіраў на палях мёрзлую бульбу. Пёк дранікі. З лісцяў ліпы вырабляў... аладкі. Хоць і не дужа прывабнымі на выгляд былі, але маці і сястрычка з задавальненнем частаваліся. З такім жа поспехам выкарыстоўваў для харчавання шчаўе, крапіву, цыбулю, іншыя расліны.

А непадалёк нястомна каціў свае магутныя воды бацюхна-Днепр. Рыбы вадзілася — процьма! А немцы забаранілі лавіць. Непаслухмяных жорстка каралі. Мясцовыя жыхары, якія нарадзіліся і выраслі побач са славутай ракой і здаўна займаліся рыбацкай справай, цяпер нават да вады не маглі наблізіцца. Людзі ад голаду пухлі. Захопнікі — жыравалі! Ды яшчэ вар'яцкія гульбішчы праводзілі.

П'янкі-гулянкі звычайна ў цёплыя сонечныя дні арганізоўваліся. На лугу натоўпам збіраліся гітлераўцы. Купаліся, галяком наперагонкі бегалі, валтузіліся, штосьці па-свойму гучна лапаталі. Потым гранаты ў раку пуляць пачыналі. Кананада грымела, аж хаты падскоквалі. Аглушаная выбухамі рыба, вялікая і зусім маленькая, сотнямі з глыбіні ўспlivала. Фрыцы спрытна лавілі. Тут жа чысцілі, мылі, распальвалі вогнішча. Жарылі, варылі, шнапс глыталі. Усю ноч куралесілі. З дзікімі крыкамі і пальбой...

Славік ненавідзеў гэтых фанабэрыстых і грубых чужакоў. Ненавідзеў усімі часцінкамі свайго маленькага дзіцячага сардэчка. Імкнуўся ні ў чым не саступаць. Нават на хітрыкі ішоў.

Хлопчыкам ён рос жвавым, непаседлівым, упартым. Цудоўна ведаў усе непрыкметныя сцяжынкі, што вялі да Дняпра, і таямнічыя мясціны, дзе можна было ад варожага вока надзейна схавацца.

Дзейнічаў, як вопытны разведчык. Толькі вартавы паверне галаву ў іншы бок, вужакай у кусты прапаўзаў. Адтуль у такую гушчэзную лазу забярэцца, у сто бінокляў не ўбачыш! Прыладкуецца з вудачкай на лужку-муражку і... рыбачыць!

Назад звычайна ноччу вяртаўся. Тым жа маршрутам. Толькі ўжо з поўным кошыкам. Адзін! У цемры! Да кожнага шораху прыслухоўваўся. Самыя небяспечныя мясціны паўзком пераадольваў.

Дома рыхтаваў смачныя стравы з рыбы. Сваю сям'ю карміў і суседзяў частаваў.

У адну з такіх небяспечных вандровак стаў сведкам жудаснага віdoвішча, аб якім потым усёй вёсцы паведаў.

...Жыў-быў у Чапліне мужык Мікалай. Добры, спакойны, вясёлы. Дужа надакучыла яму здзекі ад гітлераўцаў цярпець. Надумаў на другі бераг Дняпра перабрацца, адкуль, па яго меркаваннях, вось-вось савецкія войскі ў наступленне пойдуць.

Цёмнай дажджлівай ноччу ў човен пагрузіўся. Побач памясцілася жонка і двое дзяцей: хлопчык і дзяўчынка. Паціху пагроб. Калі да месца высадкі заставалася метраў дзесяць, нечакана з нямецкага боку асляпляльна палыхнуў пражэктар. Злосна затахкаў станкавы кулямёт. Разрыўныя кулі літаральна на часткі сям'ю разнеслі.

Дарэчы, той хлопчык, што знаходзіўся ў чоўне разам са сваімі бацькамі, быў маім аднагодкам. Шурыкам звалі. Нашы хаты па суседстве стаялі. Моцна з ім сябравалі.

На анёла падобны быў. Бялявы, гаваркі, рухавы, з блакітнымі, як васількі, вачыма. Лётчыкам марыў стаць. Ды вось... не атрымалася.

Шкада, што магілкі яго няма. Днепроўская плынь нявіннае дзіцячае цельца паглынула. І фатаграфіі не захавалася. Толькі ў памяці жыве...

Надышла восень 1943 года. Савецкія салдаты вызвалілі Лоеў. Да Чапліна — рукой падаць! Фашысты захваляваліся. Хапатліва абарону ўзяліся ўмацоўваць. Паўсюдна вартавых панаставілі, мін панатыкалі. Насельніцтву забаранілі са свайго жылля выходзіць. Парушальнікаў паабяцалі расстрэльваць.

А Славіку ў хаце не сядзіцца. Так і карцела па вуліцы прабегчы ды паглядзець, што навокал адбываецца.

Толькі за вароты выскачыў — патруль. Трое здаравенных дзецюкоў у чорнай форме з тварамі прафесійных забойцаў. На галовах — каскі. У шырачэзных далонях — аўтаматы.

Падазрона на падлетка ўставіліся. Тры кароткія ствалы груба ўперліся ў грудзі. Ледзяным холадам з іх дыхала смерць. Хлопец зразумеў: яшчэ імгненне — і яго цела прашые гарачы свінцовы град.

Рэзка скокнуў у бок. Адразу ж у суседні двор сігануў. Маланкай праз плот пераляцеў. Пятляючы, нібы заяц, да ракі панёсся.

Ззаду ўдарылі аўтаматныя чэргі. Кулі са свістам рэзанулі паветра над галавой бегляка. Бразнуўся на зямлю, па-пластунску дабраўся да абрыву. Спрытна прасунуўся праз гушчар, сцішыўся за карнявішчам паваленай бурай вярбы.

Цяжка сапучы, на верхатуры з'явіліся патрульныя. Спускацца не адважыліся. Асцярожна пахадзілі туды-сюды. Спыніліся. Прыслухоўваліся. Ускінулі аўтаматы і адначасова лупанулі з трох ствалоў уніз.

Аглушаны выстраламі хлопец доўга ляжаў нерухома. Нарэшце падняў галаву. Цішыня. Агледзеўся. Кулі, нібы брытвай, зрэзалі некалькі маладых бярозак, пасеклі кару дрэва, за якім хаваўся. На шчасце, ні адна яго не закранула...

І вось наступіў доўгачаканы дзень вызвалення. Радасці ў людзей было — не апісаць! Разам з усімі свяціўся ад шчасця і Славік.

Аднак на гэтым выпрабаванні не скончыліся. Мужчын у вёсцы амаль не засталося: хто загінуў, а хто з ворагам яшчэ змагаўся. У асноўным былі жанчыны, старыя і дзеці. Да таго ж — ні жывёлы, ні тэхнікі. А карміцца трэба было.

Хто мог трымацца на нагах, у плугі, бароны ды вазы ўпрагаліся. Сякеры і пілы ў рукі бралі. Будавалі і аднаўлялі спаленыя і разбураныя хаты. Аралі, сеялі. Паўсюдна парадак наводзілі. Столькі ж усялякага ламачча навокал валялася! Разам з дарослымі працаваў і трынаццацігадовы Славік.

Аднойчы ў Чапліне на кароткі адпачынак кавалерысты спыніліся. На фронт спяшаліся. Дзеці, як верабейчыкі, зляцеліся паглядзець. Уважліва слухалі расказы байцоў пра баі-паходы, з замілаваннем гладзілі ручкамі статных коней. А вочкі ад захаплення аж свяціліся!

Славік адразу ж звярнуў увагу на прыгожую, шэрага колеру кабылу з прыкметнай зорачкай на лбе. Жывёліна пакутліва прытулілася да стромкай бярозы і вялізнымі, разумнымі вачыма сумна глядзела на людзей. Спіна перавязана. У крыві.

Кавалерысты растлумачылі, што ўчора на маршы нямецкія самалёты іх атакавалі. Нібы каршуны аднекуль з'явіліся. Ад выбуху бомбы загінуў яе гаспадар. А Зорка, так звалі кабылу, цяжка паранена. Пэўна, доўга не працягне. А заўтра на світанку — у паход. Прыстрэліць хацелі, але рука не падымаецца такую прыгажосць губіць.

Хлопец кінуўся да камандзіра. Стаў прасіць, каб жывёліну ў вёсцы пакінулі. Абяцаў вылечыць. Той згадзіўся. З дапамогай байцоў уладкаваў Зорку ў сваім хляве і... да мясцовай знахаркі паспяшаўся. Бабуля Сцепаніда асцярожна прамыла раны гаючым бальзамам з лекавых траў, а старую павязку на беласнежную тканіну з ільну замяніла. Потым яшчэ неадназова наведвалася. А Славік дняваў і начаваў каля раненай. Як маленькае дзіця даглядаў і песціў.

Паступова жывёліна набірала моц. Незаменнай памочніцай для многіх чаплінцаў стала. Плуг з зайздроснай лёгкасцю цягала. У воз запражэш — паганяць не трэба! Пад сядлом — птушкай лятала. Захварэе хтосьці, у бальніцу імгненна дамчыць.

Людзі радаваліся ды хлопцу шчыра дзякавалі.

Займацца тады сялянскай справай было не толькі цяжка, але і небяспечна. Уся тэрыторыя вакол Чапліна нагадвала суцэльнае міннае поле. На нейкі метр звернеш з пратоптанай сцяжынкі, на хвіліну страціш пільнасць і... Амаль кожны дзень гінулі людзі. Большасць — дзеці і падлеткі. Толькі хутка справіцца з гэтай бядой было немагчыма. Вайна яшчэ грымела. Ды і колькі такіх выбуховых "падарункаў" пакінулі фашысты на шматпакутнай беларускай зямлі?

Славік вырашыў дзейнічаць. Арганізаваў групу з самых храбрых і знаходлівых падлеткаў. Цішком ад дарослых зносілі міны і снарады ў глыбокую яміну. Зверху сухія дровы клалі. Запальвалі вогнішча і хуценька ў небяспечнае месца хаваліся. Ад выбухаў аж зямля ўздрыгвала.

Аднойчы здарылася непрадбачанае.

Побач з дарогай, што вяла ў суседнюю вёску, юныя падрыўнікі выявілі невядомай канструкцыі міну. Ад яе кудысьці цягнуўся танюсенькі правадок. Славік загадаў сябрукам у небяспечнае месца адбегчы. Асцярожна знаходку агледзеў. Толькі пальцамі злёгку дакрануўся і... асляпляльна грымнула! Ён паляцеў у бездань...

Акляма́ўся на чацвёртыя суткі ў раённай бальніцы. Спавіты бінтамі. Аглушаны, аслеплены, нерухомы! У вушах стаяў раздражняльны, пранізлівы звон, нібы кавалі з усяе сілы молатамі дубасілі па кавадле.

Аказалася, магутным выбухам яго адкінула ўбок метраў на дзесяць. Цела літаральна пасечана драбнюткімі асколкамі. Адзін глыбока засеў у галаве. Хірургі не маглі дастаць.

Дарэчы, гэты кавалак металу Вячаслаў Дзмітравіч насіў у сабе аж шэсцьдзесят гадоў. З ім і памёр. А тады мала хто спадзяваўся, што хлопец выжыве. Акрамя цяжкага ранення і кантузіі, шмат крыві страціў.

І ўсё ж направіўся! У калгас на работу папрасіўся. Галоўным конюхам прызначылі. А коней — толькі Зорка. Ды і тая ў звычайным хлеўчуку ўтрымлівалася.

Пачаў з канюшні. З дапамогай сваіх аднагодкаў стары жывёлагадоўчы будынак у парадак прывёў. Першым навасёлам стала Зорка. У хуткім часе жарабец Алмаз да яе далучыўся.

Дастаўся ён дарма.

Неяк сцюдзёным лютаўскім днём цыганы ў Чапліне спыніліся. Самі змерзлі і прагаладаліся, ды і коні ледзь ногі пераставлялі. У хаты папрасіліся. На некалькі дзён.

У доме, дзе жыў Славік, стары цыган са сваім шматлікім сямействам пасяліўся. А пяцярых яго коней побач у хляве прыладкавалі.

Хлопцу адразу ж жарабец Алмаз прыглянуўся. Магутны, спакойны, прыгожы. На прагулкі вадзіў, чысціў, гуляў, карміў. Стары цыган цішком назіраў і з задавальненнем усміхаўся. Калі ж праз два тыдні надышоў час развітання, урачыста падвёў да Славіка таго жарабца з усёй ягонай збруяй.

— Бачу, хлопча, мой Алмаз табе дужа падабаецца! — сардэчна сказаў. — Дык бяры! На заўсёды! Можа, калі-небудзь цыгана Міхея добрым словам успомніш!..

Болей яны не сустракаліся. Але ўсё сваё жыццё Вячаслаў Дзмітравіч помніў гэтага цудоўнага чалавека, які столькі радасці яму прынёс. Ад Зоркі і Алмаза пародзістыя коні пайшлі. Рослыя, вынослівыя, хуткасныя! Шмат гадоў верна людзям служылі. Зямлю аралі, грузы вазілі, пад сядлом бегалі — заглядзенне!

Ні адно свята, ні адно вяселле без іх не абыходзілася. Запраўжэ, бывала, галоўны конюх сваіх скакуноў у вазы або ў сані, прымацуе да дуг меладычныя званочкі, кветкамі і рознакаляровымі лентамі ўпрыгожыць, злёгку ўзмахне пугай — і толькі пыл ці снег следам клубіцца! А калі яшчэ гармонікі граюць-заліваюцца, барабаны бадзёры дроб выбіваюць — уся акруга пяе і танцуе!..

Міналі гады. Неўзабаве мяне ў армію прызвалі. Нейкі час мы не бачыліся. Калі ў Чаплін вярнуўся, да Славіка паспяшаўся. Сустрэў, як заўсёды, ветліва і гасцінна. На той час ён быў ужо жанаты. Дзве дачкі расціў. Аню і Тамару. Яго сястра Праскоўя таксама дваіх дзяцей гадавала. А маці Васіліне восемдзесят гадкоў споўнілася.

Выпілі за сустрэчу па кілішку. Успомнілі былое і тых, каго ўжо не стала. Аб днях бягучых размову павялі. На пытанне, якія змены ў гаспадарцы адбыліся, хмура кіўнуў:

— Ніякіх!

— Чаму?

— Нашы кіраўнікі самі часам не ведаюць, што робяць! Са здзіўляючай лёгкасцю і бяздумнасцю знішчаюць тое, на што столькі сіл і здароўя страчана, што і сёння ўсім нам вельмі патрэбна. Адсюль — таптанне на месцы, недавер у людзей, апатыя!

І паведаў сумную гісторыю.

Аднойчы да іх у калгас нейкі важны чын завітаў. Тоўсты, лысы, багата апрануты. Шыя — палазы для саней можна на ёй гнуць!

Гадзіны мо дзве далдоніў мясцоваму насельніцтву, як весела ды заможна жывецца ў нас людзям. А хутка, маўляў, яшчэ лепш стане, бо родная камуністычная партыя і асабіста Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў светлае будучае для свайго народа ствараюць. Усе работы аўтаматыка выконваць будзе.

— Чым жа тады людзі займацца будуць? — перабіў гаваруна-аратара Вячаслаў Дзмітравіч.

— Як чым? — грозна зыркнуў на яго таўстун. — Вядома ж, розная электронікай кіраваць! Націснеш кнопку — і ўсё само сабой зробіцца.

— Выходзіць, і дровы не трэба будзе самому з лесу вазіць? — насмешліва заўважыў Вячаслаў Дзмітравіч. — Націснеш кнопку, самі нарэжуцца, насякуцца і да хаты прыбягуць. Яшчэ раз злёгку націснеш тую кнопку — у печ залезуць і самі ж запаляцца. А ты толькі сядзі ды пазірай. Не жыццё — маліна! Толькі не па мне яно. Сваім мазалём усё прывык рабіць. Ды і брахня ўсё гэта! Выдумкі хворых на галаву людзей. Ужо колькі гадоў нам абяцаюць нейкі камунізм пабудаваць. А дзе ён? Як хадзіў я колісь у гэтай світцы, так і цяпер не здымаю, бо новую няма за што купіць. Самотныя грошыкі атрымліваю, хаця не лайдак і не выпівоха. Такіх у нас — большасць! Ды і адкуль багаццю брацца, калі наш калгас у хвасце пляцецца. Даходаў — ніякіх! А кіраўніцтву — хоць бы што. Вунь якія спраўныя! І адзенне не жабрацкае.

Мясцовыя начальнікі аж пазеленелі ад злосці. Надумалі адпомсціць. Коней, якіх расціў і даглядаў Славік, на Гомельскі мясакамбінат адправілі. Канюшню разбурылі. А месца, дзе яна знаходзілася, узаралі!

Карацей кажучы: адным выстралам двух зайцоў знішчылі. Аб датэрміновым выкананні плана па здачы мяса дзяржаве бадзёра адрапартавалі і ўпартага падначаленага без любімай працы пакінулі.

З болем і адчаем расказваў, як груба, з брыдкаслоўем нецвярозыя дзецюкі коней на грузавікі заганялі, як з усяе сілы палкамі лупцавалі. Калі на абарону сваіх пітомцаў паспяшаўся, і яму дасталося...

— Памятаю, стаяць у кузаве побач Зорка і Алмаз, — працягваў сваю невясёлую споведзь Славік. — Сумна на мяне глядзяць, а з вачэй слёзы цякуць. Разумелі — гэта канец! Сэрца ад жалю разрывалася. Нямала дзён мінавала, а тое дзікунства не забываецца. Столькі маладых ды здаровых коней бяздумныя начальнікі пад нож пусцілі! А яны ж мноства карысных спраў для вяскоўцаў рабілі! Цяпер многія без дроў і сена сядзяць. Няма на чым прывезці, ды і агароды ў заняпадзе. Вось і надумаў каня купіць. Самым знямоглым буду дапамагаць.

— А хіба ж калгасную тэхніку нельга задзейнічаць?

— Якая тэхніка? Некалькі дапатопных грузавікоў і трактароў-развалюх! Ды і яны абы-як выкарыстоўваюцца. Сапраўднага гаспадара няма.

Назваў такі прыклад.

Адзінокай бабулі агарод спатрэбілася ўзараць. Слёзна прасіла дапамагчы. Многа раз абяцалі. Нарэшце з грукатам гусенічны трактар прыкаціў. Старая зыркнула на механізатара і... перахрысцілася: не чалавек, а нячысцік з'явіўся! Вочы заплюшчаныя. Твар — нібы толькі што ў кіпятку пабываў. Галава калматая.

Мужык з асалодай уцягнуў у сябе свежае паветра і моцна выдыхнуў. Смярдзючае воблака сівушнай атруты літаральна накрыла жанчыну. Пакуль яна прыходзіла ў сябе, кіроўца плюхнуўся на сядзенне, на штосьці націснуў. Рухавік зароў, як статак раз'юшаных бугаёў. І трактар пачаў выпісваць па агародзе васьмёркі. Раўнюткі ўчастак хутка ў суцэльныя яміны і канавы ператварыўся. У дадатак груvастая пачвара бадзёра па плоце пракацілася. Бабуля ад роспачы месца сабе не знаходзіла. З таго дня толькі з рыдлёўкай ды капаніцай у агародзе корпалася...

Неўзабаве на базе калгаса быў створаны саўгас. Змяніліся і кіраўніцтва. Славіка прызначылі паромшчыкам.

Дарэчы, паромная пераправа праз Днепр існавала ў Чапліне з даўніх часін. Дзейнічала на ручной цязе. З берага на бераг дастаўляліся не толькі людзі, але і тэхніка, грузы. Адсюль напрамкі дабіраліся да навакольных вёсак і ў Гомель. Работы ў паромшчыка хапала. Асабліва — у час уборкі траў і жніва. Даводзілася курсіраваць туды-назад ноччу, у праліўны дождж і навальніцу. Бывала, суткамі дамоў не з'яўляўся. Харчаваўся тым, што жонка прынясе. І так шмат гадоў запар.

Потым нейкая "разумная" галава вырашыла, што Чаплін — вёска неперспектыўная. А калі так, то паромная пераправа ўжо не патрэбна. І хуценька ліквідавалі зручны для мясцовых жыхароў шлях зносін.

Вячаслаў Дзмітравіч дужа перажываў. Неяк адразу пастарэў, згорбіўся. А тут яшчэ маці памерла. Потым не стала сястры, жонкі. Самога хваробы настойліва атакавалі. Балелі галава і сэрца. Рэзка зрок стаў пагаршацца. Цяжкае раненне ўсё часцей аб сабе напаміналa. Медыцынская камісія выдала пасведчанне інваліда вайны другой групы з дзяцінства. Аднак дома не сядзеў. Браў кіёк і з раніцы па даўняй звычцы абыходзіў тыя мясціны, дзе колісь працаваў. Наведваў фермы, машынны двор, палі. Цікавіўся, як ідуць справы, парады даваў. А дома штосьці майстраваў, жывёлу даглядаў...

Калі ў чарговы раз я завітаў на пабыўку, Славік ужо амаль не бачыў. Ледзь ногі перастаўляў. Моцна пахудзеў. Вельмі абрадаваўся сустрэчы. Паведаміў, што ўсю зіму ў Гомелі пражыў. У дачок. Дзякуй Богу, не забываюць! Крыху падлячыўся. Вясной моцна ў Чаплін пацягнула. У горадзе неяк цесна, дыхаць цяжка. А тут такі прастор! І паветра цудоўнае!

У вёсцы знаходзіўся не адзін. Унукі Віталь, Аксана і Віка разам прыехалі. Ежу гатавалі, бялізну мылі, у пакоях прыбіралі, дзядулю на прагулкі вадзілі. Кожныя выхадныя дочкі наведваліся. Чым маглі — дапамагалі.

Папрасіў мяне да ракі правесці.

— Мо болей не пабачу, — сумна сказаў. — З ёю ж столькі звязана!

Паціху патопалі па бязлюднай вуліцы. Быў месяц май. Цёплы, сонечны, запамінальны. Квітнелі сады. Напружана гудзелі пчолы, збіраючы гаючы нектар. Чароўна гучалі салаўіныя мелодыі. А вакол — ні душы. Толькі разбураныя ды пакінутыя хаты, сляды папялішчаў.

— Ніяк не магу зразумець, чаму нашы ўлады палічылі вёску неперспектыўнай? — узрушана выгукнуў мой спадарожнік. — Балюча глядзець! Такую прыгажосць загубілі!

Прымасціліся на крутым беразе. Унізе таямніча плёхалася рака. Над галовамі гарэзліва шапталіся маладыя прыгажуні бярозкі. Твары пяшчотна асвяжаў лёгкі ветрок.

Успомнілі, якім прывабным і маляўнічым быў Чаплін у недалёкім мінулым, якія цудоўныя і працавітыя людзі тут жылі! Хаты цягнуліся дзвюма вуліцамі ўздоўж ракі на некалькі кіламетраў. Расказваюць, што калісьці ў сівую старыну па тутэйшых мясцінах нейкі падарожнік праходзіў. Спёка стаяла невыносная. Дужа чалавек стаміўся. Піць захацеў. Вады папрасіў у сустрэчнай жанчыны. Яна жбан халоднага квасу з пограба вынесла, сытным абедам накарміла. Ды яшчэ на дарогу падсілкавацца дала. Падарожнік шчыра падзякаваў добрай жанчыне. На развітанне сказаў, што ён шмат у якіх краінах пабываў, а такую прыгажосць, як тут, упершыню бачыць. І паселішча, маўляў, занадта прасторнае. "Чапаеш, чапаеш і канца краю яму не бачна!.."

Дасведчаныя людзі сцвярджаюць, што менавіта ад слова "чапаеш" нарадзілася назва Чаплін. Але як бы там ні было, хачу засведчыць: раней жыццё тут літаральна віравала. Дзейнічалі клуб, магазін, млынца, цагельны завод, паромная пераправа і невялікі цэх па вытворчасці раслиннага масла. У мясцовай школе вучыліся дзеці з навакольных вёсак. Актыўна працавалі гурткі мастацкай самадзейнасці. Моладзі было — у кіно і на танцы не прабіцца! Ніхто не валэндаўся абы-дзе, не п'янстваваў. Кожны канкрэтнай справай займаўся. Дысцыпліну захоўваў...

Потым гаспадарка імкліва пачала зніжаць тэмпы. Тут бы, як кажуць, моцна стукнуць па ўсе званы, дзейсныя меры прыняць! Аднак раённыя і абласныя начальнікі зрабілі выгляд, што нічога асаблівага не адбываецца. Пусцілі справу на самацёк.

Бескантрольнасць, абыякавасць, патуранне да сумных вынікаў прывялі.

Шмат гадоў у Чапліне паспяхова дзейнічаў невялікі цагельны завод. Быў гонарам усёй вёскі і месцам працы для многіх людзей. Яго прадукцыя, зробленая з высакаякаснай мясцовай гліны, вялікім попытам карысталася. Значныя прыбыткі давала.

Аднойчы ў галаве нейкага чыноўніка з'явілася думка, што няблага было б на месцы гэтага прадпрыемства вадаём змайстраваць: карпікаў ды карасікаў у яго запусціць. Народ натоўпамі, маўляў, сюды паваліць! Хаця, нагадаю, Днепр побач і азёр хапае! Купайцеся да пасінення. І рыбы ад пуза! Толькі не лянуйся лавіць.

Аднак кола ўжо шпарка закруцілася. Калектыў неўзабаве разагналі. Завод зруйнавалі. Экскаватары ды бульдозеры на ўсю ваколіцу натужна затахкалі. Кар'ер, дзе каштоўную сыравіну для цэглы здабывалі, вадой залілі, берагі ў бетон "апранулі", мудрагелістымі масточкамі ўпрыгожылі...

Толькі гэты цуд-збудаванне не стала месцам масавага паломніцтва. Паступова ў заняпад прыходзіла, разбуралася. А столькі грошыкаў убухана! Ды і хто наведваць будзе, калі ў шматлюднай калісьці вёсцы толькі старыя і знямоглыя засталіся? Ды і тых — адзінкі! Моладзі наогул няма. А што ёй тут рабіць? Ні пэўнай работы, ні нармальных заробкаў, ні належнай увагі з боку мясцовых улад. Вось і разбегліся хто куды.

— А ці было магчымым змяніць становішча да лепшага, неяк абудзіць жыццё ў вёсцы? — пацікавіўся я ў Вячаслава Дзмітравіча.

— Вядома ж, была! І дужа спрыяльная, — пачулася ў адказ. — Але і тут нашы гаранчальнікі ўсё рабілі праз пень-калоду.

Аказалася, пасля чарнобыльскай бяды тут мноства перасяленцаў сабралася. Патрабавалася тэрмінова жыллём забяспечыць. А гэта ж сотні чалавек!

Дбайныя, гаспадарлівыя кіраўнікі не сталі кідацца ў паніку ды гуляць у абяцанкі-цацанкі. Дзейнічалі мудра, аператыўна, удумліва, зладжана, з перспектывай.

Узяць, напрыклад, суседнюю вёску Холмеч Рэчыцкага раёна. Там таксама нямала пакінутых хат пуставала. З садамі, агародамі, жывёлагадоўчымі памяшканнямі. Пакуль распачыналася будаўніцтва кватэр для чарнобыльцаў, мясцовыя ўлады прапанавалі прыезджым часова пасяліцца ў любой па іх выбары хаціне. Дапамогу і падтрымку абяцалі.

Свае словы стрымалі. Перш-наперш, неабходны рамонт зрабілі. Адначасова работай і палівам забяспечылі, насенне для вырошчвання сельскагаспадарчых культур выдзелілі. Потым агароджы абнавілі, дарогі асфальтам пакрылі. Неўзабаве дадатковыя магазін і кафэ-кулінарыя адкрыліся. А там і новы Палац культуры гасцінна расчыніў свае дзверы.

Многія перасяленцы так прывыклі да свайго жылля, што потым перазяджаць у новыя кватэры з усімі выгодамі адмовіліся. "Лепш без гарадскіх зручнасцяў жыць, затое са сваім садам-агародам", — гавораць яны.

Цяпер, калі па Холмечы ідзеш, сэрца радуецца. Прыгожа, чыста, утульна і... шматлюдна! А колькі дзяцей і моладзі!..

— У нас жа наадварот усё атрымалася, — з жалем адзначыў Вячаслаў Дзмітравіч. — На пустынным месцы за ваколіцай мноства хацін з дошак адна каля адной наклепалі. Спяшаліся аб датэрміновым завяршэнні работ адрапартаваць. Бедалагі-навасёлы потым часта нядобрымі словамі ўспаміналі нядбайных будаўнікоў. Шмат пакут нацярпеліся. І вадой залівала, і зімой замярзалі. Хляўчукоў не было, каб жывёлу трымаць. Некаторыя не вытрымалі — збеглі! А вёска так і засталася гібець. Горш таго, нейкі паганец стаў ноччу сядзібы падпальваць. Шэсць хат за кароткі час агонь паглынуў. У пажарышчы двое людзей загінула. Мужык і жонка. Мае суседзі. Добрыя, сціплыя людзі. Напэўна, сіл у гаротнікаў не хапіла выбрацца. А можа іншая прычына была?..

Пасля таго трагічнага здарэння Вячаслаў Дзмітравіч ужо не мог спакойна ноччу спаць. Толькі заплюшчыць вочы, пачынала казацца, што хтосьці злосны асцярожна крадзецца да яго хаты з запалкамі ў руках і вось-вось успыхне смяротнае полымя. Каб не разбудзіць унукаў, сляпы, знямоглы чалавек з цяжкасцю станавіўся на ногі, прытуляўся да сцяны і навобмацак прасоўваўся да выхаду. Доўга нерухома стаяў каля дзвярэй, напружана сціскаючы кіёк у руках, поўны рашучасці змагацца з небяспечным ворагам да апошніх сіл.

Вячаслаў Дзмітравіч шчыра прызнаўся, што калі прэзідэнтам стаў Аляксандр Лукашэнка, дужа абрадаваўся. Маўляў, малады, энергічны, прынцыповы, баявы, рашучы, нецярпімы да недахопаў. Спадзяваўся, што парадак у краіне навядзе. А калі пачуў па тэлебачанні выказванне нейкага важнага чыноўніка, што Аляксандр Рыгоравіч для нас вышэй за Бога, хуценька набыў ягоны партрэт і побач са старэнькай іконай з лікам Ісуса Хрыста на бачным месцы прымацаваў. Атрымлівалася: нібы адразу абодвум маліўся.

— З чым жа да іх звяртаўся? — пацікавіўся я.

— Прасіў, каб хутчэй наладзілася нармальнае чалавечае жыццё, а людзі, нарэшце, людзьмі сябе адчувалі. Сапраўднымі гаспадарамі сваёй зямлі сталі. Не п'янствавалі, не брыдкасловілі, любілі і паважалі адзін аднаго! І яшчэ каб назаўсёды знікла такое страшнае зло, як бюракратызм, уседазволенасць, раўнадушша і безадказнасць, якія перашкаджаюць нармальна жыць і працаваць.

— Дапамагло?

— Ды дзе там! — стомлена махнуў рукой. — Ніякіх зрухаў да лепшага не адбылося. Ні на вытворчасці, ні ў маральным пытанні. Наадварот, яшчэ горш стала. Раней кіраўнік гаспадаркі, яго намеснікі за руку пры сустрэчы віталіся. Сямейнымі справамі цікавіліся, жартавалі. Цяпер маланкай міма прашмыгнуць і нібы цябе не бачаць. Іх "прыклад" паспяхова пераймаюць начальнікі рангам ніжэй і... некаторыя рабочыя. Рыба ж з галавы гніе!

З абурэннем успомніў нядаўнюю гісторыю.

Восеньскім днём вырашыў крыху прагуляцца. З кіёчкам пакалдыбаў па прасёлкавай дарозе. Насустрач — грузавік! Імчыць, нібы зграя нячысцікаў следам гоніцца! Бульба з паўнюткага кузава градам на зямлю сыплецца. Рашуча махнуў рукой. Машына рэзка тармазнула. З кабіны высунуўся малады вадзіцель.

— Што трэба, дзед? — незадаволена буркнуў і пыхнуў у твар воблакам цыгарэтнага дыму.

— Пагаварыць сур'ёзна трэба!

— Ну, гавары, гавары.

— Што ж ты, хлопча, дабро раскідваеш? — ціха пачаў. — Хіба ж так можна?

— А табе што?

— Як што? На гэтай зямельцы я нарадзіўся і вырас і добра ведаю цану нялёгкай сялянскай працы. Так што вылазь са свайго лімузіна і збірай клубні. Усе да адзінага!

Твар хлопца пакрыўся чырваннню.

— Не буду!

— Тады дырэктару далажу!

— Ды хоць самому прэзідэнту! — злосна выгукнуў ён. — І наогул, хто ты такі? Гнілая сляпая ламачына, а здаровага мужыка павучаеш! Смяхоцце! Лепей, дзядуля, на печы сядзеў бы ды старыя косці грэў. А ты паўсюдна швэндаешся, крытыку наводзіш!..

Націснуў на газ, і толькі яго бачылі.

Пакрыўджаны і абражаны Вячаслаў Дзмітравіч доўга не мог супакоіцца. У саўгасную кантору завітаў. Потым — у сельсавет. Сваімі пачуццямі хацеў падзяліцца, спагадлівае слова пачуць. Ды дзе там! Ніхто асабліва не стаў слухаць. Маўляў, сваіх спраў па горла. Разгублена патаптаўся і ціха выйшаў...

Восеньскае неба зацягнула хмарамі. Падзьмуў моцны вецер. Сыпануў дождж. Усё адразу стала шэрым, халодным, няўтульным. А па бязлюднай вуліцы ў адзіноце гаротна плёўся стары, хворы чалавек. Інвалід вайны з дзяцінства, які амаль шэсцьдзесят гадоў сумленна працаваў у гаспадарцы, а цяпер — забыты і пакінуты.

Потым мне пазванілі ў Мінск. "Славік памёр!" — як выстралы прагучалі трывожныя і балючыя словы.

